«На пенсіі не засумую»

МС

Абарона прынцыпам…

СТАР. 4

Незвычайныя спаборніцтвы

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 МАЯ 2014 г. СЕРАДА № 92 (27702) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Ва ўрадзе

АПЕРАТЫЎНЫЯ РАШЭННІ ГРУЗНУЦЬ ВА ЎЗГАДНЕННЯХ І СУМНЕННЯХ

Урад гатовы ісці на глыбокія структурныя рэформы

Учора прайшло пасяджэнне Савета Міністраў. Урад падвёў вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі за студзень—сакавік 2014 года і ацаніў выкананне заданняў на першае паўгоддзе. На жаль, праблем засталося яшчэ шмат, хаця ёсць і пэўны пазітыўны эфект.

УНУТРАНЫЯ АБАРОТЫ ХОЛДЫНГАЎ ВЫЗВАЛЯЦЬ АД ПАДАТКАЎ?

Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч адразу звярнуў увагу на тое, што сёння ад Саўміна патрабуецца прыняцце аператыўных і сістэмных захадаў, каб выпраўляць праблемы. «Пакуль што ва ўрада так працаваць не атрымліваецца, — прызнаў прэм'ер. — Па многіх відавочных пытаннях рашэнні не прымаюцца вельмі працяглы час. Усё грузне ва ўзгадненнях, сумненнях і гэтак далей. І гэта тычыцца не толькі ўрада, але і мясцовай улады».

Міхаіл Мясніковіч акрэсліў праблемныя бакі эканомікі і зрабіў некалькі прапаноў па іх ліквідацыі: «Па-першае, неабходны рашучыя захады па аздараўленні і глыбокай рэструктурызацыі прамысловага комплексу нашай краіны. Вынікі мінулага і чатырох месяцаў гэтага года сведчаць, што традыцыйная мадэль развіцця прамысловага комплексу сябе вычарпала. Сітуацыя складаная, але міністэрствы не маюць варыянтаў выйсця з сітуацыі». На думку прэм'ер-міністра, у першую чаргу трэба перагледзець сістэму кіравання і знізіць выдаткі. «Холдынгі, на якія рабілася стаўка, рэальна яшчэ не запрацавалі, — заявіў кіраўнік урада. — Таму пакуль мы абмежаваліся механічным аб'яднаннем прадпрыемстваў. Звяртаюся да Адміністрацыі Прэзідэнта з просьбай пасадзейнічаць у працы над указам па холдынгах, праект якога ўнёс урад. З 1 студзеня 2015 года, я думаю, трэба ўкараніць у холдынгах прынцып кансалідаванага плацельшчыка — іншымі словамі, вызваліць унутраныя абароты ад падаткаў».

Другая група праблем тычыцца ўдасканалення працы аграпрамысловага комплексу. «Сельская гаспадарка мінусуе ўжо чацвёрты месяц запар. Ёсць шмат фактаў безгаспадарчасці. Гэта сведчыць, што асноўная прычына сітуацыі — суб'ектыўныя фактары. Праблема ў кадрах, якія альбо не ўмеюць належным чынам весці гаспадарку, альбо ўсё ведаюць, але не робяць, як трэба. Ужо пачаўся перыяд нарыхтоўкі кармоў. Даручаю адмяніць на гэты час усе адпачынкі, доўгія камандзіроўкі адказных асоб для таго, каб сканцэнтравацца на выкананні тэхналогій і рэгламентаў», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

СТАЎКІ ПА РУБЛЯХ ТРЫМАЦЬ НЕ БУДУЦЬ?

Прэм'ер-міністр закрануў і іншыя актуальныя задачы. Напрыклад, абарону ўнутранага рынку, грашова-крэдытную і валютную палітыку. «Мяркую, што сёння ў краіне няма ніякіх эканамічных падстаў для падтрымкі працэнтных ставак па рублёвых інструментах на такім высокім узроўні, — заявіў кіраўнік урада. — Для чаканай інфляцыі стаўкі ў 39-40% гадавых — ненармальна. У найбліжэйшы час золатавалютныя рэзервы краіны вырастуць рэальна, і, з улікам дадатнага сальда, трэба заканчваць з гэтымі спекулятыўнымі стаўкамі». Перад пасяджэннем сітуацыю на крэдытна-дэпазітным рынку журналістам патлумачыла старшыня праўлення Нацыянальнага банка Надзея Ермакова: «У дачыненні да працэнтных ставак Нацбанк будзе праводзіць палітыку паступовага зніжэння. Гэта значыць, яны плаўна павінны зніжацца, але да разумнай мяжы. Тое ж — па курсавой палітыцы. Мы будзем працягваць палітыку паступовага зніжэння кошту нацыянальнай валюты», — сказала кіраўнік Нацбанка. Нагадаем, што стаўка рэфінансавання з 19 мая зніжана на 1 працэнтны пункт да 21,5% гадавых. «Ці будзем зніжаць далей — жыццё пакажа, як будзе складвацца сітуацыя на макраўзроўні і ў цэлым у свеце», — паведаміла Надзея Ермакова.

Гаварыў таксама Міхаіл Мясніковіч пра гарады-спадарожнікі, якія павінны стаць кропкамі эканамічнага росту. Акрамя таго, прэм'ер заклікаў усіх зыходзіць у працы з новай рэчаіснасці Еўразійскага эканамічнага саюза. Яшчэ кіраўнік урада выступае за ўдасканаленне дзяржпадтрымкі: «Яна павінна быць конкурснай, даступнай для ўсіх формаў уласнасці».

РОСТ ПРАЗ СКАРАЧЭННЕ

Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў дадаў пазітыву ў агульную карціну. Пачаўшы свой даклад з экспарту і імпарту, ён назваў вынік першага квартала добрым: «Дадатнае сальда знешняга гандлю склала 678 млн долараў, прычым як па таварах, так і па паслугах. Прырост сальда забяспечаны, перш за ўсё, за кошт зніжэння імпарту». Сярод прычын поспеху — не толькі адсутнасць залішняга крэдытавання эканомікі, але і меншы «націск» на прадпрыемствы па давядзенні аб'ёмаў прамысловай вытворчасці.

СТАР. 2

2014 IIHF WORLD CHAMPIONSHIP BELARUS Minsk

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СВЯТА ХАКЕЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА!

У час матча Беларусі і Латвіі, у якім наша дружына атрымала цяжкую, але такую неабходную перамогу, страсці кіпелі не толькі на лядовай пляцоўцы «Мінск-Арэны» — не менш «спякотна» было і на трыбунах. Інакш і быць не магло: гэта быў ключавы, вырашальны матч за выхад у чвэрцьфінал турніру. І хакеісты не падвялі сваіх балельшчыкаў: прыхільнікаў зборнай Беларусі чакаюць новыя перажыванні за любімую каманду.

Але прыемныя сюрпрызы дорыць балельшчыкам не толькі сам чэмпіянат. Учора, перад матчам паміж зборнымі Беларусі і Расіі, які адбыўся позна ўвечары, стартаваў аматарскі хакейны турнір, прысвечаны чэмпіянату. Учора ў паўфінальных гульнях у Лядовым палацы на Прытыцкага сустрэліся каманды «Сталіца» (чэмпіёны Мінска сярод аматарскіх клубаў) і «ГазпрамЭкспарт», а на лёдзе арэны хакейнага клуба «Юнацтва» — зборная «Легенды СССР» і каманда Прэзідэнта Беларусі. Балельшчыкі атрымалі магчымасць убачыць у гульні легендарных хакеістаў — Мышкіна, Якушава і іх калег па пераможнай зборнай Саюза, а таксама ветэранаў беларускага хакея. Гуляў за сваю каманду і Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь працягвае жыць хакеем. Сапраўдным святам, якое назаўжды застанецца з намі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр РУМАК, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:

«Сям'я — гэта рухомы сацыяльны інстытут. Для сучаснай беларускай сям'і характэрна павышэнне ўзросту ўступлення ў шлюб, адкладванне нараджэння дзяцей на больш познія тэрміны, пазашлюбныя саюзы. Разам з тым, як сведчаць вынікі сацыялагічных даследаванняў, сямейнае шчасце, наяўнасць дзяцей застаюцца прыярытэтамі ў сістэме каштоўнасцяў усіх пакаленняў, у тым ліку і моладзі. Тэндэнцыі, якія назіраюцца ў апошні час, сведчаць аб умацаванні інстытута сям'і. Галоўны аргумент — рост нараджальнасці. Летась нарадзілася амаль 118 тыс. дзяцей, а гэта самы высокі паказчык за апошнія 20 гадоў. Павялічваецца і склад беларускіх сем'яў: каля 50% народжаных дзяцей з'яўляюцца другімі, трэцімі і г.д.».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.05.2014 г.

Долар ЗША		10040,00	▲
Еўра		13750,00	▼
Рас. руб.		290,00	▲
Укр. грыўня		843,70	▲

За пашпарт у Мінску цяпер можна аплаціць праз інтэрнэт

Паслугі, якія аказваюць падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі ГУУС Мінгарвыканкама, падключаны да Адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы (АРІП), паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.

У МУС растлумачылі, што цяпер аплату можна правесці праз інтэрнэт-банкінг, мабільны банкінг, інфакіёскі і іншыя ўстройствы, якія прымаюць плацяжы. Размова ідзе аб такіх адміністрацыйных працэдурах і паслугах, як выдача і абмен пашпарта грамадзяніна Беларусі; дадатковая плата за выдачу і абмен пашпарта ў паскораным парадку; афармленне заявы; атрыманне SMS аб гатоўнасці дакумента да выдачы; рэгістрацыя замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ў нашай рэспубліцы.

■ Сацыяльны ракурс

Грашовыя выплаты на дзяцей-сірот павялічаны

Для недапушчэння пагаршэння ўмоў утрымання дзяцей-сірот у апякунскіх і прыёмных сем'ях, у дзіцячых дамах сямейнага тыпу, дзіцячых вёсках (гарадках), штомесячныя грашовыя выплаты на харчаванне дзяцей-сірот, забеспячэнне іх адзеннем, абуткам, школьнапісьмовымі прыладамі, мяккім інвентаром, прадметамі асабістай гігіены і іншымі прадметамі першай неабходнасці былі павялічаны ўрадам на 10%.

Як удакладнілі «Звяздзе» ў галоўным адукацыйным ведамстве, пастанова Савета Міністраў № 433 ад 6 мая 2014 года прадугледжвае таксама павелічэнне на 6% грашовых нормаў выдаткаў на харчаванне дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі і знаходзяцца ў дзіцячых інтэрнатных установах і ўстановах адукацыі.

Таксама на 10% былі павялічаны грашовыя нормы выдаткаў на забеспячэнне адзеннем, абуткам, мяккім інвентаром і школьнымі прыладамі дзяцей-сірот, якія знаходзяцца ў інтэрнатных установах, у дзяржаўных установах прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ВЫПАДКУ АДМОВЫ ЕЎРОПЫ АД РАСІЙСКАГА ГАЗУ ЯГО АДПРАВЯЦЬ У КІТАЙ

Такое меркаванне ў інтэрв'ю агенцтву Bloomberg выказаў прэм'ер-міністр РФ Дзмітрый Мядзведзеў, падкрэсліўшы, што гэта пакуль тэарэтычная магчымасць, паведамляюць інфармагенцтвы. «У нас дастаткова магчымасцяў, у нас дастаткова газу для таго, каб пастаўляць і па ўсходнім маршруце, і па заходнім. Але калі разгледзець зусім дрэнную перспектыву, газ (выключна тэарэтычна), які можа быць не пастаўлены ў Еўропу, можа быць адпраўлены ў Кітай. Але гэта, падкрэсліваю, абсалютна пакуль тэарэтычная магчымасць», — сказаў Дзмітрый Мядзведзеў. У той жа час Мядзведзеў скептычна ставіцца да перспектывы продажу ЗША звадкаванага газу ў Еўропу. На яго думку, такі газ абыдзецца еўрапейцам на 40% даражэй за трубаправодны з Расіі.



У ПАДМАСКОЎІ СУТЫКНУЛІСЯ ЦЯГНІКІ: ЁСЦЬ АХВЯРЫ

Два цягнікі сутыкнуліся ў Нара-Фамінскім раёне Маскоўскай вобласці, ёсць пацярпелыя. Паводле даных інфармагенцтваў, чатыры чалавекі загінулі, яшчэ 15 атрымалі траўмы. Здарэнне адбылося каля станцыі Бекасава. З рэек сышлі вагоны таварнага цягніка, пасля чаго яны сутыкнуліся з вагонам пасажырскага цягніка, які рухаўся па маршруце Масква — Кішынёў.

ВЫВЯРЖЭННЕ ВУЛКАНА Ў САЛЬВАДОРЫ

Каля 1400 жыхароў цэнтральнаамерыканскай рэспублікі Сальвадор былі вымушаныя пакінуць свае дамы з-за слупа попелу, выкінутага вулканам Сан-Мігель. Эвакуацыя людзей — неабходная мера засцярогі на выпадак поўнамаштабнага вывяржэння.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ІСЛАНДЫЯ І ЯПОНІЯ — КРАІНЫ ДОЎГАЖЫХАРОЎ

Японія доўгі час знаходзіцца на першым месцы ў спісе краін доўгажыхароў. Але цяпер яе даганяе Ісландыя. У цэлым жа працягласць жыцця ў свеце расце, піша The Daily Mail. Такім чынам, дзяўчынка, якая нарадзілася ў 2012 годзе, хутчэй за ўсё, дажыве да 73 гадоў. А хлопчык — да 68. Гэта на 6 гадоў больш у параўнанні з паказчыкамі дзяцей, народжаных у 1990 годзе. Што тычыцца доўгажыхароў, то першае месца сярод жанчын па-ранейшаму займаюць японкі (87 гадоў — сярэдні паказчык). А вось ісландцы б'юць мужчынскі рэкорд — 81 год. У краінах з вялікім прыбыткам сярэдняя працягласць жыцця мужчыны складае 76 гадоў, што на 16 гадоў больш у параўнанні з данымі бедных краін. У жанчын паказчыкі складаюць 82 гады супраць 63.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

ЛЕТНІЯ КАНІКУЛЫ ПАД ЗНАКАМ СПАКОЮ

Нават надзіманы басейн у дварах можа стаць для вашага дзіцяці зонай рызыкі

Праз лічаныя дні ў школьнікаў пачнуцца доўгачаканыя летнія канікулы. А гэта азначае не толькі працяглы адпачынак, але і тое, што цяпер на цэлыя тры месяцы кантроль за хлопчыкамі і дзяўчынкамі нярэдка перакладаецца цалкам на плечы родных.

ПРАФІЛАКТЫКАЙ ПАВІННЫ ЗАНЯЦЦА БАЦЬКІ

Забараніць малому пазнаваць свет немагчыма. Таму задача дарослых — заўжды быць на крок спераду, падстрахаваць сына ці дачку. І пакуль дзіцяці не споўніцца хаця б пяці-шасці гадоў, спускаць з яго вачэй нельга ўвогуле. Нарматыўнага дакумента, які рэгламентуе ўзрост дзіцяці, калі яго можна пакідаць аднаго, у Беларусі, на жаль, не існуе. У некаторых краінах ён у той жа час пазначаны і складае 12 гадоў...

У некаторых краінах свету дзяцей дазваляецца пакідаць адных толькі з 12 гадоў.

— Кожнай узроставай групе ўласцівы найбольш тыповыя траўмагенныя сітуацыі, — гаворыць **начальнік рэспубліканскага цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алена ДЗМІТРУК.** — У маленстве дзіця толькі пачынае арыентавацца ў прасторы. Таму ў малых да трох гадоў часцей за ўсё здараюцца апёкі і падзенні з вышыні.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал 2014 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Індэкс/перыяд	1 месяц	3 месяцы
63850 (для індывідуальных падпісчыкаў)	57 000	171 000
63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў)	51 300	153 900
63858 (для ведамасных падпісчыкаў)	125 000	275 000
63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя)	112 500	337 500

■ АПК: праблемы і рашэнні

СПІСВАЦЬ ДАЎГІ НІХТО НЕ БУДЗЕ

У Магілёўскай вобласці шукалі метады ўдасканальвання працы АПК і павышэння адказнасці кіраўнікоў

Дзяржава падтрымлівае сельскаю гаспадарку, але той аддачы, на якую яна разлічвае, пакуль няма. Так акрэсліў праблемы, якія склаліся ў тым ліку і ў Магілёўскай вобласці, прэм'-ер-міністр краіны Міхаіл Мясніковіч падчас свайго візіту ў Круглянскі раён.

— Прэзідэнт даў шмат даручэнняў кіраўніцтву вобласці, але выкананне цэлага шэрагу іх не забяспечана, — адзначыў ён у размове з журналістамі. — Гэта датычыцца і завяршэння рэканструкцыі МТФ у планавых аб'ёмах, і павелічэння пагалоўя кароў, і іншых пытанняў. У Магілёўшчыны самы нізкі паказчык у краіне за першы квартал па валавым рэгіянальным прадукце — 95,5%. Трэба ўбачыць тыя недахопы, якія перашкаджаюць пад'ёму вобласці. Патэнцыял ёсць неблагі. Яго трэба задзейнічаць, прычым зрабіць гэта ў першую чаргу за кошт кадраў.

Па выніках працы аграрнай галіны за мінулы год 87 сельскагаспадарчых арганізацый Магілёўскай вобласці (52% ад агульнай колькасці) спрацавала з рэнтабельнасцю менш за 5%, у тым ліку 20 — са стратамі, якія склалі 132 мільярды рублёў. На іх пакрыццё з бюджэту накіравана больш за 156 мільярдаў. «Гэтыя грошы пайшлі не на развіццё галіны, а на кампенсацыю безгаспадарчасці і страт», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

І негатыўная тэндэнцыя захоўваецца. Ужо за першыя 2 сёлетнія месяцы колькасць стратных арганізацый у Магілёўскай вобласці ўзрасла з 1 за аналагічны леташні перыяд да 9. Страты ад рэалізацыі атрымалі 14 гаспадарак.

Нявыкарыстаныя рэзервы ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі за мінулы год ацэньваюцца па Магілёўскай вобласці ў 1,6 трыльёна рублёў. Адначасова знізілася колькасць буйной рагатай жывёлы, дойных кароў, упалі аб'ёмы надояў малака.

У зале Круглянскага райвыканкама, дзе адбылася нарада, было па-сапраўднаму горача.

Міхаіл Мясніковіч паведаміў, што асноўная работа па вывучэнні сітуацыі ў АПК краіны выканана, кіраўніку дзяржавы прадстаўлены адпаведныя пісьмовыя даклады, а таксама праекты дакументаў, якія, па меркаванні міжведамаснай працоўнай групы, дапамогуць палепшыць клімат у АПК. Ні ў адным дакументе не ідзе гаворка аб спісанні даўгоў.

Для стабілізацыі працы сельскагаспадарчай галіны спатрэбіцца вырашыць тры групы пытанняў, якія Прэзідэнт даручыў разгледзець больш дэталёва. Гэта прыняцце неабходных мер для падаўлення безгаспадарчасці; увядзенне больш дасканалага механізму развіцця вёскі (у першую чаргу за кошт аздараўлення грашова-крэдытнай палітыкі); рэструктурызацыя запазычанасці і радыкальная рэарганізацыя хранічна стратных гаспадарак. 27 мая запланавана справаздача кіраўнікоў гар- і райвыканкамаў па пытаннях АПК у кіраўніка дзяржавы. Яны павінны будуць адказаць, чаму працуюць не на поўную сілу і не выкарыстоўваюць тыя патэнцыяльныя магчымасці, якія прадстаўлены дзяржавай.

У зале Круглянскага райвыканкама, дзе адбылася нарада, было па-сапраўднаму горача. Балюча ўспрымаліся словы аб тым, што такія вядучыя гаспадаркі, як «Вейна» і «Дашкаўка», цяпер у заняпадзе, што вобласць па паказчыках у межах краіны «скацілася» з цвёрдага другога месца на перадапошняе — пятае. Але ж шмат чаго залежыць не толькі ад кадраў, але і ад умоў. З трыбуны аграрыі казалі аб болевых кропках сельскай гаспадаркі, аб тым, што не заўсёды тэхніка дапамагае ў бітве за ўраджай, што тое абсталяванне для малочнатаварных ферм, якое пастаўляецца на тэндарных умовах, мае шэраг недапрацовак. Шмат нараканняў датычылася і фінансавых абавязкаў, якія значна перавышаюць памеры прыбытку, жорсткай крэдытнай палітыкі банкаў у дачыненні да АПК.

Губернатар вобласці Пётр Руднік сярод прычын, якія прывялі сельскагаспадарчую галіну вобласці ў заняпад, абазначыў такія, як нізкая выручка СВК (фінансавыя абавязкі перавышаюць іх прыбытак у 1,5 раза), высокая закрэдытаванасць сяла (агульная запазычанасць перад банкамі складае 80%), недахоп кваліфікацыйных кадраў (кіруючага звяна, заатэхнікаў, ветэрынараў). На яго погляд, палепшыць становішча дапаможа аптымізацыя гаспадарак, рэструктурызацыя запазычанасці для ўсіх сельгаспрадпрыемстваў, падрыхтоўка спецыялізаваных кадраў з улікам сучасных тэхналогій, стварэнне холдынгаў, якія б займаліся ўсім працэсам ад вытворчасці сыравіны да рэалізацыі гатовай прадукцыі з высокім дабаўленым коштам.

Падчас размовы з кіраўнікамі гаспадарак і райвыканкамаў, дзе склаліся найгоршыя ўмовы, кіраўнік урада выказаў сумненне наконт адпаведнасці некаторых з іх займаемым пасадам. Губернатару вобласці рэкамендавана да 27 мая прыняць кадравыя рашэнні наконт самых слабых кіраўнікоў, якія «вызначыліся» неэфектыўнасцю вядзення гаспадаркі.

— Трэба мяняць логіку мыслення, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Сёння на першае месца выходзіць дыктатура тэхналагічнай вытворчасці. Без гэтага казаць аб прарыве нельга.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

■ Узровень

Сяргей МАСКЕВІЧ:

«ПАТРАБУЕЦЦА ПЕРААСЭНСАВАННЕ ЗМЕСТУ РАБОЧЫХ ПРАФЕСІЙ»

На працягу двух дзён (21 і 22 мая) 160 маладых людзей з установ прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, а таксама маладыя рабочыя і спецыялісты будуць змагацца ў Футбольным манежы за званне лепшага па 20 прафесіях. Усе, хто наведае ў гэтыя дні павільёны манежа, змогуць паназіраць за прафесійнымі спаборніцтвамі зваршчыкаў і муляраў, абліцоўшчыкаў і сталяроў, цырульнікаў і афіцыянтаў, сеткавых адміністратараў і мехатронікаў.

«Першы нацыянальны чэмпіянат прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus—2014 дапаможа зразумець, у якім стане знаходзіцца наша прафесійная адукацыя і наколькі кампетэнцыі, якімі валодаюць навучэнцы і выпускнікі беларускіх устаноў адукацыі, адпавядаюць сусветным стандартам падрыхтоўкі спецыялістаў», — заявіў на сустрэчы з журналістамі з гэтай нагоды **міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ.**

Па словах кіраўніка галоўнага адукацыйнага ведамства, 70 працэнтаў прадукцыі, што вырабляецца ў Беларусі, арыентавана на экспарт. Але для таго, каб выпускаць канкурэнтаздольную на знешніх рынках прадукцыю, патрабуюцца не толькі сучасныя тэхналогіі, але і спецыялісты самай высокай кваліфікацыі, якія змогуць працаваць на сучасным абсталяванні. Адпаведна, ацэньваць іх падрыхтоўку мы павінны, выкарыстоўваючы міжнародныя індыкатары якасці.

Як падкрэсліваў **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Аркадзь ШКЛЯР,** у Беларусі праводзіцца шмат спаборніцтваў па асобных прафесіях. Але WorldSkills International — гэта, так бы мовіць, Алімпійскія гульні ў прафесійнай адукацыі. Таму конкурс WorldSkills Belarus—2014, які папярэднічае сусветнаму чэмпіянату, будзе праведзены на самым высокім узроўні. Важна, што конкурс праводзіцца па сучасных кампетэнцыях і дапаможа прадставіць грамадскасці новы імідж людзей вытворчай працы, які адпавядае іх рабоце ў новых умовах.

— Апошнім часам мы часта чуем, што рабочыя прафесіі — непапулярныя і непрэстыжныя. Спадзяёмся, што нацыянальны чэмпіянат дазволіць прадэманстраваць, што сучасныя рабочыя — гэта людзі з вельмі розным адукацыяй. Ёсць прафесіі, дзе рабочаму хапае прафесійна-тэхнічнай адукацыі, але ёсць прафесіі, і іх становіцца ўсё больш, дзе ад рабочага персаналу патрабуецца наяўнасць сярэдняй спецыяльнай і нават вышэйшай адукацыі, — падкрэсліў Сяргей Маскевіч. — Заказчыкі кадраў настойваюць на тым, што ў сувязі з шырокамаштабнай мадэрнізацыяй у прамысловасці ім сёння патрабуюцца спецыялісты, якія валодаюць адначасова некалькімі кампетэнцыямі, гэта значыць, спецыялісты, якія могуць не толькі выконваць пэўныя аперацыі на абсталяванні, але і абслугоўваць яго. Патрабуюцца кадры для інавацыйных тэхналогій. Увогуле, тэрмінова патрабуецца пераасэнсаванне ў грамадстве напаўнення і зместу рабочых прафесій.

Адказваючы на пытанне журналіста «Звязды» наконт ідэальнай прапорцыі размеркавання патокаў выпускнікоў паміж рознымі ўзроўнямі прафесійнай адукацыі, Сяргей Маскевіч паведаміў наступнае:

— Магу сказаць, што вядучыя краіны свету (Японія, ЗША, еўрапейскія краіны) арыентуюцца на тое, каб ад 40 да 60 працэнтаў работнікаў мелі вышэйшую адукацыю. Для прыкладу, у ЗША, згодна з канцэпцыяй, якую зацвердзіў Барак Абама, колькасць моладзі з вышэйшай адукацыяй павінна вырасці да 2020 года да 60 працэнтаў. Мы мяркуем, што толькі 40—50 працэнтаў выпускнікоў сярэдніх школ здольныя засвоіць праграму вышэйшай школы. Летась у вышэйшыя навучальныя ўстановы паступіла каля 40 працэнтаў выпускнікоў гэтага года. Затое вырас працэнт тых, хто пайшоў атрымліваць сярэднюю спецыяльную адукацыю, што не можа нас не радаваць. Моладзь павінна зразумець: галоўнае — стаць прафесіяналам і цалкам сябе рэалізаваць, а зусім не пагоня за дыпломам.

Разам з тым, у Міністэрстве адукацыі не спяшаюцца адмініструюць патокі выпускнікоў. У прыватнасці, неаднойчы агучвалася думка, што ў старшыя класы павінны прыходзіць толькі тыя вучні, якія не проста жадаюць, але і могуць засвойваць вучэбную праграму, што школа «не камера захоўвання» для гультаёў. Чакалася, што падчас перагляду Кодэкса аб адукацыі ў новым дакументе будзе занатаваны конкурсны адбор у 10-я класы. Да таго ж у Нацыянальным інстытуце адукацыі цяпер выконваецца навукова-даследчая работа, у рамках якой прапрацоўваюцца мадэль і механізмы знешняй атэстацыі за базавую школу.

— У бліжэйшы час мы не будзем уводзіць бар'еры ў старшую школу, — сказаў кіраўнік галоўнага адукацыйнага ведамства. — Але эксперыменты ў гэтым кірунку плануем праводзіць.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

АПЕРАТЫЎНЫЯ РАШЭННІ ГРУЗНУЦЬ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Вынік пацвярджае, што можна працаваць эфектыўна без валавых паказчыкаў. Яшчэ раз падкрэслю, што збалансаванасць знешняга гандлю атрымалася не праз нарошчванне экспарту, а праз рацыянальную працу з прамежкавым імпартам, які выкарыстоўваецца для вытворчасці нашай прадукцыі». У той жа час міністра непакоіць зніжэнне экспартных магчымасцяў: напрыклад, у Расіі нашы тавары выцясняюцца заходнееўрапейскімі і амерыканскімі.

Інфляцыя за паўгоддзе перавысіць прагноз, але не нашмат. 8-8,5% супраць ранейшага прагнозу 7,1%. «Значна на гэта паўплывае сезонны рост цэн на садавіну і гародніну, а таксама на паслугі па міжнародных перавозках, звязаных з турызмам. Акрамя таго, павышаюцца цэны на мяса птушкі, паколькі ўзнік дэфіцыт свініны».

Нягледзячы на тое, што эканоміка расце (па выніках чатырох месяцаў адзначаны рост ВУП на 1,1%), Мікалай Снапкоў таксама гаворыць аб неабходнасці рэформаў. Асноўныя элементы такога рэфармавання: змяненне структуры органаў дзяржкіравання і перагляд іх функцый, змяненне палітыкі эфектыўнасці кіравання дзяржаўнай маёмасцю, сістэмы планавання эканомікі, падыходаў да дзяржпадтрымкі. Па словах міністра эканомікі, эканамічнае асяроддзе знаходзіцца цяпер у стане стрэс-тэсту, а таму будучыня залежыць ад таго, як гэты тэст будзе пройдзены. «Калі мы зробім правільныя высновы з крызісу 2011 года, то зразумеем, што трэба мяняцца. І пачынаць неабходна з сістэмы кіравання эканомікай», — упэўнены міністр.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ВЯСНА Ў ГОМЕЛІ

Эканамічны форум з гістарычным ухілам

Больш за 400 чалавек з 29 краін свету сталі ўдзельнікамі XI Гомельскага эканамічнага форуму.

Фота БЕЛТА.

Для разгляду бізнесменам прапанавалі больш за 120 інвестыцыйных праектаў. Гэта інфармацыя аб 140 аб'ектах нерухомасці, якія можна набыць у тым ліку за адну базавую велічыню, а таксама 185 зямельных участках, прапанаваных без аўкцыёну для рэалізацыі інвестпраектаў.

На пленарным пасяджэнні Гомельскі аблвыканкам падпісаў інвестдагаворы і пратаколы з замежнымі кампаніямі, у тым ліку з Германіі, Харватыі, Нідэрландаў, Аўстрыі. Удзельнікі мерапрыемства правялі шэраг абмеркаванняў у межах секцый «Аграпрамысловы комплекс», «Будаўнічы і жыллёва-камунальны комплекс», «Лагістыка і гандаль», «Турызм і сацыяльна-эканамічнае развіццё тэрыторый», «Малы і сярэдні бізнес. Умовы развіцця прадпрымальніцкіх ініцыятыў».

Да арганізацыі экспазіцый вялікай рэгіянальнай выставы «Вясна ў Гомелі 2014», размешчанай у Палацы лёгкай атлетыкі, арганізатары — гомельскае аддзяленне беларускай гандлёва-прамысловай палаты — падышлі творча. На 5 тысячах квадратных метраў спарткомплексу «Дынама» прадукцыю прадстаўляюць каля 200 прадпрыемстваў розных галін з Беларусі, Расіі, Украіны і Малдовы — ад ювелірных вырабаў і ежы да камбайнаў. Усё гэта аформлена ў стылі дарэвалюцыйнага Гомеля — са старымі назвамі вуліц: Губернскай алеі, Мясніцкай, Замкавай, Фельдмаршальскай, Мільённай... Між тым, па некаторых «вуліцах» цікава прагуляцца не толькі афіцыйным дэлегацыям, але і простым грамадзянам. У тым ліку для таго, каб прадэгуставаць прадукты харчавання ці набыць нейкія тавары.

Апроч таго, вакол спарткомплексу праходзяць спадарожныя акцыі, канцэрты і выставы. Уся тэрыторыя вуліцы Кожара, дзе размяшчаецца «Горад майстроў», была загадзя распісана да метра. Менавіта таму на працягу некалькіх дзён тут свае выставы-продажы вырабаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці, кветак, майстар-класы прапануюць народныя рамеснікі і аматары разнастайных напрамкаў «хэндмэйду». Трэба адзначыць і тое, што сёлета «Вясна ў Гомелі 2014» прысвечана 95-годдзю Гомельскай губерні. Менавіта таму ў яе межах праходзіць фотавыстава, на якой прадстаўлены ўнікальныя архіўныя фотаздымкі.

Генеральны дырэктар гомельскага аддзялення гандлёва-прамысловай палаты Марына Філонава адзначае, што 80% праектаў, падпісаных на мінулых інвестыцыйных форумах, знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі. А гэта гаворыць пра высокую выніковасць і плённасць дыялогу ўлады і бізнесу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Разам

У АДНОЙ ЛОДЦЫ

Першы кангрэс дзяржаўна-прыватнага партнёрства

На гэтым тыдні спецыялісты Мінэканомікі пачалі рэгістрацыю ўдзельнікаў Дзён дзяржаўна-прыватнага партнёрства (ДПП). Прэс-служба міністэрства паведамляе, што 27-30 мая ў Мінску ў межах сумеснага праекта ЕС, ПРААН і Міністэрства эканомікі Беларусі «Умацаванне нацыянальнага патэнцыялу ў галіне прымянення механізмаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства» адбудзецца першы ў нашай краіне кангрэс, які прысвечаны такому супрацоўніцтву.

Падчас Дзён ДПП пройдзе шэраг дыскусій па ключавых аспектах узаемадзеяння ўлады і бізнесу. Асноўнай мэтай такіх перамоў стане ўключэнне ўсіх зацікаўленых бакоў у абмеркаванне праблем і перспектыў дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў Беларусі. Удзельнікі атрымаюць унікальную магчымасць азнаёміцца з вопытам і рэкамендацыямі вядучых экспертаў у гэтай сферы з Вялікабрытаніі, Кітая, Нідэрландаў, Расіі, Харватыі, Швейцарыі і іншых краін.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Погляд

СЕНСАЦЫІ ЭКЗАТЫЧНЫХ ВЫБАРАЎ

З 7 красавіка па 12 мая ў Індыі прайшлі чарговыя прэзідэнцкія выбары. Вядома, для еўрапейскіх краін такая працягласць выбараў можа здацца вельмі незвычайнай, але справа ў тым, што ў Індыі больш за 800 млн выбаршчыкаў, а гэта робіць працэдуру галасавання досыць складанай, прымушаючы праводзіць яе ў 9 этапаў. Спрыяе такой працягласці і складанасці і сама сістэма выбарчага галасавання, якую часта называюць экзатычнай. Вынікі выбараў прынеслі некалькі сенсацый.

Першай з іх стала самая высокая яўка з 1984 года: у выбарах прынялі ўдзел 66,38% ад колькасці зарэгістраваных у краіне выбаршчыкаў. Другой сенсацыяй стала самае горшае (у працэнтных суадносінах) паражэнне кіруючай партыі за ўвесь час незалежнасці Індыі: партыя Індыйскі нацыянальны кангрэс (ІНК) атрымала менш за 20% галасоў у ніжняй палаце.

Бхаратыя джаната парці (БДП), што атрымала большасць галасоў на выбарах, з'яўляецца правай партыяй, якую паўсюдна называюць за мяжой «арганізацыяй індуісцкіх нацыяналістаў». Для яе гэта найлепшы вынік за ўсю гісторыю з моманту стварэння ў 1980 годзе, які дазваляе з атрыманымі 282 дэпутацкімі мандатамі ў ніжняй палаце стварыць урад самастойна, без неабходнасці прыцягнення саюзнікаў. Праўда, гэта азначае, што і адказваць за вынікі кіравання другой у свеце па колькасці насельніцтва краінай прыйдзецца таксама поўнасцю самастойна.

Новым прэм'ер-міністрам Індыі стаў Нарэндра Модзі, які быў дагэтуль галоўным міністрам Гуджарата, сёмага па плошчы тэрыторыі і дзясятага па колькасці насельніцтва штата краіны. Але, што больш важна, менавіта ў кіраўніцтве Нарэндра Модзі гэтым штатам і крыецца галоўны сакрэт такой зруйнавальнай для ІНК перамогі БДП на выбарах. Вынікі кіравання Гуджаратам Модзі часта называюць эканамічным цудам, параўноўваючы з тымі вынікамі, што дасягнуты найбольш паспяховымі правінцыямі Кітая ў апошнія гады.

Так, у 2010 годзе Модзі заявіў, што «доля Гуджарата ў прамысловасці Індыі складае 16%, у экспарце — 22%, у вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі — 35%, у вытворчасці нафтахімічнай прадукцыі — 62%».

Пры такім сцэнарыі развіцця падзей новыя магчымасці трэба не ўпусціць і беларускім экспарцёрам, вынікі працы якіх у Індыі пакуль цяжка назваць здавальняючымі.

У заслугу Нарэндра Модзі ставяць і небывалыя па мерках Індыі тэмпы росту сельскагаспадарчай вытворчасці ў штаце: з 2006 па 2010 гады яны склалі 12,8% у год на фоне 2% у цэлым па краіне. Гэтаму росту спрыяе і стварэнне базы даных па прадуктыўнасці глебы. База, створаная ў апошнія гады, дазваляе прадастаўляць рэкамендацыі па ўнясенні ўгнаенняў. Усе вёскі штата падключаны да электрасеткі, што для Індыі з'яўляецца вялікім дасягненнем.

Пры гэтым не будзем забываць пра тое, што большасць выбаршчыкаў Індыі жыве ў сельскай мясцовасці і хацела б тых жа вынікаў у сваіх вёсках, што не магло не адбіцца на выніках галасавання на апошніх выбарах.

Адной з заслуг Модзі стала шырокае прыцягненне ў эканоміку штата замежных інвестараў. Больш за 20% з ліку найбуйнейшых 500 карпарацый свету зрабілі ўкладанні ў Гуджарат. Штат стаў месцам канцэнтрацыі альтэрнатыўнай энергетыкі Індыі. У тым ліку тут размешчана і найбуйнейшая ў краіне сонечная электрастанцыя. Робяцца крокі па фарміраванні электроннага ўрада, якія пазітыўна ацэньваюцца насельніцтвам. Пры гэтым адзначым і тое, што беспрацоўе ў штаце знаходзіцца на самым нізкім узроўні ў Індыі і складае каля 1%. Не дзіўна, што ў выніку гэты штат адзін з тых, дзе найбольш высокі ўзровень жыцця ў краіне.

Калі Нарэндра Модзі, стаўшы прэм'ер-міністрам, зможа распаўсюдзіць такі ўдалы вопыт мадэрнізацыі эканомікі ў Гуджараце на ўсю краіну, рэзка павялічыўшы тэмпы росту індыйскай эканомікі, Індыя зможа набыць новы статус у свеце ў сярэднетэрміновай і доўгатэрміновай перспектыве.

Пры такім сцэнарыі развіцця падзей новыя магчымасці трэба не ўпусціць і беларускім экспарцёрам, вынікі працы якіх у Індыі пакуль цяжка назваць здавальняючымі. Могуць аказацца запатрабаванымі і магчымасці для буйных індустрыяльных прадпрыемстваў Беларусі па стварэнні зборачных вытворчасцяў на індыйскай тэрыторыі. Пры ІНК Індыя была вядомая як краіна з досыць закрытай эканомікай для прыходу замежных інвестараў.

Гэта дрэнныя навіны для ІНК, самай старой і самай вядомай за мяжой палітычнай партыі Індыі. Са станоўчых для ІНК момантаў эксперты ў першую чаргу адзначаюць, што ў верхняй палаце ў ІНК засталося дастаткова дэпутацкіх месцаў, каб накладаць вета на непажаданыя для партыі законапраекты канкурэнтаў. Таксама немалаважна і тое, што ў рэгіянальных парламентах у ІНК па-ранейшаму захоўваецца больш дэпутацкіх месцаў, чым у Бхаратыя джаната.

Акрамя таго, у гісторыі Індыі гэта здараецца ўжо чацвёрты раз, калі ІНК губляе свой статус кіруючай партыі. Ва ўсе папярэднія разы ў канкурэнтаў не атрымлівалася надоўга захаваць набытую на выбарах папулярнасць, дазваляючы ІНК сабрацца з сіламі, мабілізавацца і вярнуцца да ўлады.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

МАГІЛЁЎСКІЯ ХАКЕІСТЫ АТРЫМАЛІ НЕЧАКАНЫ ПАДАРУНАК

Калі ў інтэрнэце з'явілася інфармацыя аб тым, што Магілёўскі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па хакеі з шайбай атрымаў 75 мільёнаў ад вядомага беларускага хакеіста Міхаіла Грабоўскага, яго супрацоўнікі спыталі нейкае змешанае пачуццё радасці з лёгкай разгубленасцю.

— Гэта стала для нас нечаканасцю, — прызнаўся дырэктар гэтай установы Віктар Васількоў. — Мы пакуль нават не да канца ўсвядомілі, наколькі інфармацыя адпавядае рэчаіснасці. Інтэрнэт — гэта не дакумент. Пакуль не будзе афіцыйнай паперы, якая гэта пацвердзіць, нават не бяруся каментаваць падзею. Калі ўсё спраўдзіцца, мы будзем вельмі ўдзячны спартсмену, які нават ніколі не трэніраваўся ў нас. Гэтыя грошы нам вельмі былі б дарэчы. Ёсць патрэба ў спартыўным інвентары, сродках для паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПАКЕТ АКЦЫЙ ПРАДПРЫЕМСТВА «ГРОДНА АЗОТ» ВЫСТАЎЛЕНЫ НА ПРОДАЖ

Гэтымі днямі аб'яўлены конкурсны адбор інвестара для ўдзелу ў прыватызацыі адкрытага акцыянернага таварыства «Гродна Азот». Такім чынам Дзяржаўны камітэт па маёмасці прапануе патэнцыяльнаму інвестару дзяржаўны пакет каштоўных папер прадпрыемства колькасцю каля 1,63 млн штук акцый, доля якіх у статутным фондзе таварыства складае 25% плюс 1 акцыя.

Пакет гэтых акцый будзе прададзены па кошце не ніжэй за 414 млн долараў ЗША. Акрамя таго, інвестар павінен будзе накіраваць у статутны фонд завода грошы ў аб'ёме не менш як 440 млн долараў, за якія новы ўласнік набудзе дадатковы выпуск акцый прадпрыемства па іх рынкавым кошце. Такім чынам інвестару дазваляецца мець ва ўласнасці агульны пакет акцый у аб'ёме не больш чым 50% плюс 1 акцыя статутнага фонду «Гродна Азот». Прадугледжваецца, што гэтыя 440 млн долараў будуць накіраваны на мадэрнізацыю вытворчасці дзейнага прадпрыемства.

Гэты інвестыцыйны праект прадугледжвае фінансаванне новым уласнікам будаўніцтва новага азотнага комплексу, а таксама наяўнасць у інвестара ўласнага рэсурсу або гарантыі пастаўшчыка газу на заключэнне з ім кантракта на пастаўку прыроднага газу ў аб'ёме, які забяспечвае поўную загрузку вытворчых магутнасцяў таварыства «Гродна Азот» і новага азотнага комплексу на працягу не менш за 10 гадоў.

Конкурсны адбор адбудзецца сёлета 29 ліпеня ў Мінску.

Сяргей КУРКАЧ.

ЧЫГУНАЧНЫ «БУМ»

У перыяд майскіх свят па Беларускай чыгунцы было перавезена больш за 900 тысяч пасажыраў.

Цягнікамі міжрэгіянальных, рэгіянальных ліній бізнес-класа і міжнародных ліній скарысталіся больш як 908 тысяч чалавек. З іх у межах Беларусі цягнікамі міжрэгіянальных ліній і рэгіянальных ліній бізнес-класа было перавезена амаль 670 тысяч пасажыраў, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.

Як у міжрэгіянальных, так і ў міжнародных зносінах у святочны перыяд па Беларускай чыгунцы курсіравалі дадатковыя цягнікі. У тым ліку ў міжнародных зносінах разам з Расійскай чыгункай дадатковыя цягнікі былі прызначаны па такіх запатрабаваных маршрутах, як Брэст — Масква — Брэст, Мінск — Масква — Мінск, Брэст — Санкт-Пецярбург — Брэст.

Сяргей РАСОЛЬКА.

РАНІШНЯЯ ГІМНАСТЫКА Ў ПАРКУ ЖЫЛІБЕРА

Раніцай у аўторак каля 20 гродзенцаў паважанага, так бы мовіць, сярэбранага ўзросту прыйшлі ў парк імя Жылібера, каб заняцца... гімнастыкай. Гэта сумесны праект ветэранскіх арганізацый, ГрДУ імя Янкі Купалы, упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

— Сёлета пры нашай ветэранскай арганізацыі была створана група аматараў, якія займаюцца плаваннем. Яны ж ахвотна падтрымалі і прапанову наконт заняткаў ранішняй гімнастыкай. Спадзяёмся, што падключацца і іншыя людзі, — кажа старшыня Савета ветэранаў Ленінскага раёна г. Гродна Барыс Мулаў.

Заняткі будуць праводзіць студэнты-валанцёры факультэта фізічнай культуры Купалаўскага ўніверсітэта, прычым па спецыяльнай праграме — з улікам узросту людзей, каб яны атрымлівалі аздараўленчы эфект. Дарэчы, будзе задзейнічаны і гімнастычны «інструментарый», які закуплены для заняткаў.

— Гэта, безумоўна, будзе на карысць нашым ветэранам. Ды і нам у радасць, што можам аказаць ім такую паслугу, — зазначае начальнік аддзела маладзёжнай палітыкі ГрДУ імя Янкі Купалы Алена Поцька.

Мяркуецца, што ранішняя гімнастыка ў парку Жылібера спачатку будзе праводзіцца тры разы на тыдзень — у аўторак, сераду і чацвер, а потым, магчыма, і часцей. Пачатак у 9 гадзін.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

МТС ПАПЯРЭДЗІЎ АБ ПАВЫШЭННІ ТАРЫФАЎ

З 26 мая аператар мабільнай сувязі МТС павялічвае кошт некаторых паслуг сувязі.

Павелічэнне тарыфаў закране абаненцкую плату, званкі ўнутры сеткі, SMS-паведамленні, а таксама некаторыя сэрвісныя і кантэнтныя паслугі. Выдаткі абанентаў на паслугі сувязі павялічацца ў сярэднім на 8%.

Разам з тым, кошт мабільнага і фіксаванага інтэрнэту застанецца нязменным, удакладнілі ў прэс-службе мабільнага аператара.

Таксама на ранейшым узроўні застанецца плата за званкі на нумары іншых аператараў, міжнародныя выклікі, паслугі міжнароднага роўмінгу, усе пазіцыі на сацыяльным тарыфным плане «Асаблівы».

Не зменяцца і ўмовы выплат за абсталяванне, набытае ў растэрміноўку.

Разам з тым, МТС рыхтуе унікальную прапанову, скарыстацца якой можна будзе ўжо з 1 чэрвеня. Яе сутнасць заключаецца ў тым, што абаненты змогуць больш кантактаваць, але без павелічэння выдаткаў на сувязь.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЗА ЗЛОЎЖЫВАННЕ ЎЛАДАЙ

Два намеснікі старшыні Гомельскага аблвыканкама падазраюцца ў карупцыі і злоўжыванні ўладай і службовымі паўнамоцтвамі, паведамілі ў Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь.

Як расказаў на брыфінгу ў Гомелі першы намеснік старшыні СК Аляксей Волкаў, Следчым камітэтам праводзяцца працэсуальныя дзеянні па крымінальнай справе, якая расследуецца ў дачыненні да адказных асоб Гомельскага аблвыканкама. Крымінальная справа аб злоўжыванні ўладай і службовымі паўнамоцтвамі заведзена Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь па матэрыялах Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС. Па ўказанай справе затрыманы два намеснікі старшыні Гомельскага аблвыканкама, якія цяпер даюць паказанні следчым. Дзеянні адказных асоб кваліфікаваны па ч.3 артыкула 424 Крымінальнага кодэкса РБ.

Акалічнасці злачынства і прозвішчы затрыманых пакуль не паведамляюцца.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

21 мая 2014 г. № 9 (329)

ТЭМА ДНЯ

ДАПАМАГЧЫ, АЛЕ Ў МЕЖАХ ЗАКОНА

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Што прымушае грамадзян з рэгіёнаў Мінскай вобласці імкнуцца патрапіць на прыём непасрэдна да старшыні аблвыканкама Сямёна Шапіры? Вера ў «вышэйшую справядлівасць»? Немагчымасць вырашыць пытанні ў райвыканкаме, раённым, пасялковым, сельскім Саветах дэпутатаў? Думаецца, што прычына ў іншым, а менавіта — у псіхалогіі чалавека.

Людзі ідуць на прыём з рознымі пытаннямі: уладкаванне дарог, водазабеспячэнне, газіфікацыя сельскіх населеных пунктаў. Скардзяцца на работу камунальнікаў, нясвоечасовую здачу ў эксплуатацыю жыллёвых кааператываў і дрэнную якасць будаўніцтва. Звяртаюцца і з просьбамі перагледзець судовае рашэнне, паўздзейнічаць на следства. На што заўсёды атрымліваюць катэгарычнае: «Не!»

З даверанасцю ад сына

Бываюць і зусім неардынарныя, дзіўныя сітуацыі. Вельмі ўразіў прысутных выпадак, што здарыўся падчас выязнога прыёму ў Пухавіцкім раёне. Да губернатара звярнулася маці з... даверанасцю ад роднага сына. Не, яе крывінка не інвалід. Наадварот, здаровы, жанаты.

Пасля заканчэння навучальнай установы хлопца накіравалі на працу (ветэрынарным урачом) і нават выдзелілі дома маладой сям'і жыллё. Але спецыяліста не задавальняе месца работы, і ён пісьмова даверыў сваёй маці прадстаўляць яго інтарэсы ў розных інстанцыях наконт іншага працаўладкавання. Сямён Шапіра прызнаўся, што з такой сітуацыяй сустракаецца ўпершыню, і параіў маладому мужчыну свае пытанні вырашаць асабіста. Разам з тым, растлумачыў, што, паводле заканадаўства, яму давядзецца адпрацаваць у гаспадарцы два гады. У іншым выпадку ён павінен вярнуць дзяржаве грошы, патрачаныя на вучобу.

«Залатыя» капальні

У апошні час усё часцей гучыць тэма пясчана-гравійных кар'ераў. Гэта вельмі прыбытковая справа. Некаторыя фірмы за год атрымліваюць «з пяску» па 500 млн долараў чыстага прыбытку. Зразумела, што ніхто не хоча развітвацца з «залатой жылай».

Напрыклад, дырэктар аднаго з сумесных прадпрыемстваў пераехаў у Пухавіцкі раён з Латвіі, атрымаў пасведчанне на права жыхарства. Ён папрасіў выдзеліць фірме кар'ер для здабычы пяску. У Дзяржынскім раёне прыватнікі таксама спрабавалі адстаяць свае правы на «залатыя капальні». Справа ў тым, што адной з іх быў выдзелены кар'ер з умовай, што яна пабудуе завод па вытворчасці дарожна-будаўнічых матэрыялаў. Але замест гэтага фірма занялася продажам пясчана-гравійнай сумесі грамадзянам і прадпрыемствам.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС»)

СВАЯ СПРАВА

«НА ПЕНСІІ НЕ ЗАСУМУЮ»

Слаўгарадчанка Людміла Чабатар лічыць, што жыць трэба цікава

Гэту цемнавокую жанчыну з вясёлым характарам, напэўна, ведаюць у Слаўгарадскім раёне ўсе. І хаця жыве яна ў невялікай вёсцы Міхайлоў, спраўляецца і гаспадарку весці, і клубнай працай у суседняй вёсцы займацца, ды яшчэ і з інфармацыйна-сацыяльным поездам «Клопат» курсіраваць па раёне.

Акрамя гэтага, яна — староста вёскі і гаспадыня аграэкасядзібы з амаль аднайменнай назвай «Міхайлава». А з гэтага года выконвае яшчэ і дэпутацкія абавязкі.

Усё пачалося са... смецця

— Я ўжо нават і не памятаю, колькі гадоў староста, — усміхаецца Людміла і спрабуе падлічыць. — Напэўна, не менш за сем. Вёска ў нас невялікая, каля 27 двароў, але не ўсе яны «жывыя». Некаторыя жыхары прыпісаны тут, але маюць кватэры ў Слаўгарадзе. На правах старасты назіраю за пажарнай сітуацыяй, наведваю пажылых, сачу за парадкам.

Старшыня Кабінагорскага сельскага Савета Вадзім Сівухін працай Людмілы задаволены, таму і ініцыюе яе вылучэнне ў дэпутаты. Па сутнасці, яна і раней шмат чаго для аднавяскоўцаў рабіла. І не безвынікова. Некалькі гадоў таму тут існавалі цяжкасці з вывазам смецця. На ўсю вёску не было ніводнага кантэйнера, людзі збіралі адходы ў мяшкі і вывозілі іх самастойна. Але ж не ва ўсіх былі машыны. Аднойчы Людміла не вытрымала і паехала на прыём да кіраўніка Слаўгарадскага камунгаса. Той толькі паціснуў плячыма: «Дзе ж я табе грошы на кантэйнеры знайду?» Але Людміла не з тых, хто на паўдарозе спыняецца. З аднаго кабінета пайшла ў другі — да кіраўніка раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Той пранікся праблемай, а галоўнае, такім шчырым да яе стаўленнем і... дапамог з набыццём кантэйнераў. З тых пор парадку ў вёсцы стала значна больш.

Да мясцовай улады староста звяртаецца толькі ў выпадку крайняй неабходнасці. А з такімі «дробязямі», як траву пенсіянерам пакасіць ці бак для смецця залатаць, спраўляецца сваімі сіламі разам з мужам. Навошта людзей ад іх спраў адцягваць?

— У вёсцы так усе жывуць, адно аднаму дапамагаюць, — кажа яна. — Пакуль малады, ніякая праца не палохае. Вось старэнькім цяжкавата прыходзіцца. Таму ім мы ні ў чым не адмаўляем.

Сваю дэпутацкую працу жанчына плануе пачаць з добраўпарадкавання дарогі: па ёй ужо даўно «рамонт плача».

З песняй па жыцці

Па адукацыі Людміла рэжысёр, узначальвае сельскі клуб у вёсцы Рудня — ад Міхайлова гэта каля кіламетра. Жыхароў няшмат, але яна не дае ім сумаваць. Запрашае ў розныя гурткі, ладзіць святы. Вядома, што без грошай сёння нічога не зробіш, але не была б яна дэпутатам, калі б не мела «таленту» іх знаходзіць. Кажа, што і яе прафесія, і грамадская пасада маюць шмат агульнага: і ў тым, і ў іншым выпадку без спонсараў не абысціся.

Спяваць і танцаваць яна любіла з дзяцінства, але ў вялікай сям'і, дзе выхоўвалася 5 дзяцей, бацькі не маглі купіць дачцэ піяніна. Так склалася, што даўнюю мару стаць работнікам культуры Людміла здзейсніла толькі ў 47 гадоў. Пасля школы спрабавала прайсці конкурс у Кішынёўскае музычнае вучылішча імя Штэфана Нягі, якое ў свой час скончыла Сафія Ратару. Шанцы былі, але сустрэўся на шляху каханы чалавек, і яна зрабіла іншы выбар. У 18 гадоў стала маці і вельмі ўдзячна Богу за такі лёс. Лічыць, што галоўнае ў жыцці — гэта сям'я і дзеці. Усё астатняе можа пачакаць. Яна і сяброўцы дапамагла не страціць сваё шчасце. Тая не магла вырашыць: ехаць ёй на вучобу ці да каханага. Што параіла ёй Людміла? Вядома, адпраўляцца да каханага. І яшчэ напрарочыла прыгажуню дачушку. Сказала, што ад вялікага кахання нараджаюцца толькі прыгожыя дзеці. Ці той пасыл быў вельмі моцны, ці проста супадзенне, але праз некаторы час усё так і атрымалася.

Сама Людміла выхавала дачку і сына. Цяпер у яе шасцёра ўнукаў.

А мара стаць спявачкай усё ж спраўдзілася. У складзе аўтаклуба, як яна называе інфармацыйна-сацыяльны поезд «Клопат», жанчына аб'ехала ўсе вёскі, што ёсць у раёне. Уключаючы і тыя, дзе жывуць усяго 2-3 чалавекі. «Зоркі» эстрады да іх не даязджаюць, а вось Людміла Чабатар з задавальненнем запаўняе гэты «прабел». У яе рэпертуары якіх толькі песень няма — народныя, эстрадныя, лірычныя, танцавальныя... Удзячныя слухачы імкнуцца хоць чымсьці аддзячыць. Адна бабулька, якой вельмі даспадобы прыйшліся Людміліны спевы, падарыла ёй самае каштоўнае з таго, што мела — свае вышыванкі.

Пірагі ад Людмілы

Яна не толькі добрая спявачка, але і таленавіты кухар. У свой час працавала ў бістро, і цяпер гэтыя веды вельмі спатрэбіліся. Па лініі пярвічнай арганізацыі «Сяльчанка» Беларускага саюза жанчын займаецца выпечкай піцы, пірагоў і іншай смакаты, якая на розных кірмашах і фестывалях разыходзіцца на «ўра». Яна тройчы станавілася лаўрэатам рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур «Мотальскія прысмакі». Там Людміла цалкам свая: і спяваць майстрыха, і кулінарыць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС»)

ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА

ЭЛЕКТРОННАЕ ДЭКЛАРАВАННЕ ДАПАМОЖА ХУТЧЭЙ ПЕРАСЕКЧЫ МЯЖУ

У Брэсце прайшоў семінар Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны «Практыка прымянення мытнага заканадаўства ва ўмовах Мытнага саюза».

Парламентарыі мелі магчымасць вывучыць асобныя моманты работы законаў на практыцы. Для гэтага яны наведалі міжнародныя пункты пропуску «Казловічы» і «Варшаўскі мост», а таксама транспартна-лагістычны цэнтр «Брэст-Белмытнясэрвіс».

Ацэнка работы мытнікаў і памежнікаў, якая прагучала падчас адкрыцця пленарнага пасяджэння з вуснаў **намесніка старшыні парламента Віктара ГУМІНСКАГА,** была даволі высокай. Сёння дагаворная база Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы ўключае ў сябе больш за 150 міжнародных дагавораў. Нашай краінай ратыфікавана каля 70 дакументаў у рамках Мытнага саюза і 17 дагавораў па фарміраванні АЭП. Гэта вельмі вялікі пласт работы.

Але галоўнае, сёлета чакаецца гістарычная падзея — падпісанне Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Яго рэалізацыя запатрабуе кадыфікацыі ўсёй нарматыўна-прававой базы Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. Перад парламентамі нашых краін паўстануць новыя, яшчэ больш складаныя задачы, якія давядзецца вырашаць. Бо Адзіная эканамічная прастора, паводле слоў Віктара Гумінскага, — гэта новыя магчымасці для развіцця бізнесу, нарошчвання экспарту тавараў і паслуг унутры рынку трох краін. І як вынік — стварэнне ўмоў для годнага жыцця і свабоднага развіцця 170 мільёнаў грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыі 20 мільёнаў квадратных кіламетраў.

На Брэсцкай мытні.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Як вядома, у 2013 годзе быў прыняты закон «Аб мытным рэгуляванні ў Рэспубліцы Беларусь», які ўступіў у сілу ў красавіку гэтага года. Цяпер яго трэба канчаткова прывесці ў адпаведнасць з агульным заканадаўствам Мытнага саюза і АЭП. На гэты конт дзяржаўнай мытнай службай ужо падрыхтаваны чатыры праекты ўказаў, — паведаміў дэпутатам **намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Сяргей БАРЫСЮК.** Ён жа расказаў, як мытня дабілася значнага скарачэння часу на афармленне грузавога транспарту. На 24 пунктах пропуску краіны праходзіць у сярэднім 28 тысяч аўтамабіляў за суткі. Большасць часу кожны вадзіцель траціць на пераход ад службы да службы і чаканне кантролю. Дык вось, калі санітарны і ветэрынарны кантроль грузаў перадалі пад ведамства мытні, час на прахаджанне кантролю для кожнага аўтамабіля скараціўся прыкладна на 15 хвілін. Чвэрць гадзіны — гэта сотня лішніх грузавікоў, якія могуць перасячы мяжу на кожным пераходзе за суткі. Гэта ўжо сур'ёзнае дасягненне.

Сёння таксама гаворка ідзе пра пераход на поўнае электроннае дэклараванне, што дазволіць істотна палепшыць прахаджанне мытных фармальнасцяў і скараціць іх час.

Міністр па мытным супрацоўніцтве Еўразійскай эканамічнай камісіі Уладзімір ГОШЫН сказаў, што не за гарамі час, калі паўстане пытанне аб адмене працэдуры мытнага пераафармлення. Калі б удалося дасягнуць адпаведных дамоўленасцяў з краінамі Еўропы і груз афармлялі па адзіным стандарце адразу з першапачатковага пункта ў канцавы, не давялося б яго на нашых мытнях пераафармляць, як гэта робіцца сёння. І тады час праходжання на мяжы з дзвюх-трох гадзін скараціўся б да паловы гадзіны. Гэта быў бы прынцыпова іншы ўзровень супрацоўніцтва наогул. Недзе 90% грузаў, якія праходзяць праз межы Мытнага саюза, паводле сцвярджэння Уладзіміра Гошына, не ўяўляюць сабой нейкай небяспекі. Таму працэдуру іх праверкі можна смела скарачаць. Такім чынам можна пакласці пачатак новай сістэме перамяшчэння грузаў ад Уладзівастока да Лісабона.

Але ж гэта, на думку дэпутатаў, справа больш далёкай перспектывы. Пра бліжэйшыя праекты расказаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР.** І перш за ўсё мелася на ўвазе рэканструкцыя, ці правільней сказаць, узвядзенне новага пункта пропуску «Пясчатка», дзе замест 2 палос руху будзе 16. Гэты сумесны з Еўрасаюзам праект знаходзіцца ў стадыі актыўных будаўнічых работ. А на стадыі двухбаковага абмеркавання другі праект — будаўніцтва новага Варшаўскага моста. Не, сам пункт пропуску пад такой назвай дастаткова сучасны і адпавядае ўсім патрабаванням. Малым і вузкім для патоку машын стаў уласна мост праз раку, які даў назву пераходу. Наспела патрэба ўзвесці новы мост або пабудаваць другі побач. Тады чарга машын на мяжы стане значна меншай.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

«ДЭПУТАТ ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ, ЧЫМ ЖЫВУЦЬ ЯГО ВЫБАРШЧЫКІ»

Гэтая думка прайшла праз усю нашу размову са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Святланай ГЕРАСІМОВІЧ.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Святлана Міхайлаўна, нядаўна фінішавалі выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Ці задаволены вы іх вынікамі?

— Выбары прайшлі вельмі дастойна, арганізавана. 77,4% выбаршчыкаў, уключаных у спісы, прагаласавалі за сваіх кандыдатаў. У выбарах жа дэпутатаў сельскіх Саветаў наогул прынялі ўдзел больш за 90% мясцовых жыхароў. Думаю, гэтыя лічбы пераканалі тых, хто сумняваўся ў правільнасці прынятага летась рашэння аб тым, што неабходна захаваць Саветы дэпутатаў пярвічнага ўзроўню. З 18 809 дэпутатаў усіх узроўняў, крыху больш за 14 тысяч дэпутатаў сельскіх Саветаў. Больш за палову з іх выбрана паўторна на другі ці на трэці тэрмін. Гэта сведчыць аб тым, што людзі даверяюць сваім дэпутатам. Радуе і тое, што сёлета сярод кандыдатаў было нямала маладых людзей. Я б раіла моладзі з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй прайсці дэпутацкую школу, бо бясцэнны вопыт працы з людзьмі абавязкова спатрэбіцца на шляху па кар'ернай лесвіцы.

— Якія чаканні вы, як старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, ускладаеце на дэпутатаў новага склікання?

— Дэпутаты — сувязное звяно паміж грамадзянамі і органамі ўлады. Таму яны павінны рэгулярна кантактаваць са сваімі выбаршчыкамі, шукаць ініцыятывы «знізу» і падымаць іх на адпаведны ўзровень. Людзі прыходзяць да свайго дэпутата з праблемамі, часам болем, і ўдзел і спачуванне тут немалаважныя. Нават калі сітуацыя складаная і імгненна яе немагчыма вырашыць, трэба растлумачыць, чаму гэта так, а не карміць людзей пустымі абяцаннямі. Вельмі важна, каб дэпутат не толькі ініцыяваў, але і кантраляваў вырашэнне праблем, якія закранаюць інтарэсы простых жыхароў, расказваў ім аб зменах у заканадаўстве. Ужо разглядаецца і, спадзяюся, неўзабаве будзе прыняты праект закона з прапановай Савета па ўзаемадзеянні ўвесці адзін вольны ад асноўнай работы дзень у месяц з захаваннем сярэдняй заработнай платы для работы дэпутата ў сваёй выбарчай акрузе. Гэтае наваўвядзенне, пераканана, пойдзе на карысць простым людзям, будзе добрым стымулам для больш актыўнага выканання дэпутатамі сваіх абавязкаў.

— Раскажыце пра дзейнасць камісіі, якую вы ўзначальваеце?

— Члены Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні займаюцца законапраектнай дзейнасцю. Праекты законаў, якія мы разглядаем, тычацца, па сутнасці, кожнага жыхара: яны звязаны з жыллёва-камунальнай гаспадаркай, гандлем, транспартам, мясцовым самакіраваннем, аграрнай палітыкай, прыродакарыстаннем і аховай навакольнага асяроддзя, адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам дзяржавы. Савет Рэспублікі ўжо адобрыў 25 законапраектаў, якія рыхтавала наша камісія. Цяпер працуем над яшчэ 10 сур'ёзнымі праектамі, звязанымі з пытаннямі чыгуначнага транспарту, абароны інфармацыі, аховы азонавага слоя, пахавальнай справы і іншыя. Перш чым адобрыць праект закона, мы праводзім маніторынг меркаванняў усіх зацікаўленых. У новым скліканні стварылі навукова-кансультатыўны савет, у які ўваходзяць прафесары, акадэмікі, кіраўнікі буйных прадпрыемстваў. Гэта дае магчымасць пры прыняцці законапраектаў яшчэ больш улічваць пазіцыю вучоных, грамадскасці, людзей, якія працуюць непасрэдна ў вызначанай сферы.

> **“Спадзяюся, неўзабаве будзе прыняты праект закона аб увядзенні аднаго вольнага ад асноўнай работы дня ў месяц з захаваннем сярэдняй заработнай платы для работы дэпутата ў сваёй выбарчай акрузе.**

— Пры Савеце Рэспублікі з 2007 года функцыянуе Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, які стварауся для каардынацыі дзейнасці дэпутатаў усіх узроўняў. Ці выконвае ён сваё прызначэнне?

— У свой час я прымала ўдзел у стварэнні Савета па ўзаемадзеянні. Гэта вельмі патрэбная, важная грамадская структура, якая дае магчымасць дэпутатам усіх узроўняў больш цесна ўзаемадзейнічаць. Мы рэгулярна праводзім выязныя пасяджэнні, дзе абмяркоўваем пытанні, якія хвалююць людзей. Да нашых прапаноў прыслухоўваюцца дзяржаўныя структуры. Нашы рэкамендацыі, як правіла, прымаюць да ўвагі, уключаюцца ў праекты прававых актаў. Так, у прыватнасці, дзякуючы ініцыятыве нашага калегіяльнага органа спецыялізаваным арганізацыям перададзены вуліцы, дарогі, водаправоды. Цяпер працуем над тым, каб і арганізацыю добраўпарадкавання на буйных могілках ускласці на спецыялізаваныя арганізацыі. Па нашай ініцыятыве сёння, у адпаведнасці з Указам ад 4 лютага 2014 года № 59, сродкі, атрыманыя ад продажу зямельных участкаў на аўкцыёнах ці ад іх арэнды, мясцовыя Саветы могуць выкарыстоўваць на добраўпарадкаванне тэрыторый, навядзенне парадку на зямлі. Цяпер у сувязі з нядаўнімі выбарамі абнаўляецца і Савет па ўзаемадзеянні, у яго састаў, па традыцыі, увойдуць самыя вопытныя і ініцыятыўныя дэпутаты.

— Вядома, што ад ініцыятывы (у тым ліку і па прыцягненні грошай у мясцовы бюджэт) дэпутатаў на месцы ў многім залежыць дабрабыт мясцовых жыхароў. Можаце прывесці прыклады ініцыятыў, якія, на вашу думку, вартыя пераймання?

— Калі я працавала старшынёй Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, мы ўвялі планёркі пры старшынях сельсаветаў з удзелам усіх кіраўнікоў на тэрыторыі Савета. Гэта вельмі важна, бо тое, наколькі хутка вырашаюцца мясцовыя праблемы, у многім залежыць ад таго, наколькі эфектыўна паміж сабой узаемадзейнічаюць старшыня райвыканкама, сельвыканкама, кіраўнік лясгаса, дырэктар школы і г.д. Таксама варты для пераймання вопыт самаабкладання Гомельскай вобласці. Там дэпутаты выступілі з ініцыятывай збіраць грошы на добраўпарадкаванне. Так і ва ўсім. Галоўнае — паказаць прыклад. І людзі яго падхопяць.

— На якім этапе знаходзіцца працэс аптымізацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу пярвічнага ўзроўню? Ці патрэбны наогул дэпутаты сельскіх Саветаў?

— Аптымізацыя сельсаветаў ідзе паступова, паэтапна, абдумана, з улікам меркаванняў мясцовых жыхароў. Бо само жыццё падштурхоўвае да таго, што, як правіла, лепш за ўсё вырашаюцца пытанні тэрыторый, калі там ёсць адна буйная гаспадарка і адзін буйны сельсавет. Але з любога правіла ёсць выключэнне. Так, мясцовыя ўлады (у прыватнасці, у Нясвіжскім і ў Лагойскім раёнах) паглядзелі, што вострай неабходнасці нешта мяняць пакуль няма і вырашылі захаваць некаторыя невялікія сельсаветы, колькасць жыхароў якіх не перавышае 1000 чалавек. У тых жа сельсаветах, якія ліквідавалі, людзі не засталіся без увагі. Недзе пакінулі па спецыялісту, недзе ўвялі выязны дзень, калі раз на тыдзень спецыялісты сельвыканкама выязджаюць у вёску, дзе быў раней сельсавет, і прымаюць людзей. У Магілёўскай вобласці, напрыклад, вельмі эфектыўна працуе лакальная аўтыматызаваная інфармацыйная сістэма «Мясцовыя саветы».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС»)

СЕСІЯ

ВЫЗНАЧЫЛІСЯ З ПРЫЯРЫТЭТАМІ

Магілёўскія дэпутаты вызначылі склад 6 пастаянных камісій і выбралі прэзідыум

У рабоце другой сесіі Магілёўскага аблсавета дэпутатаў прынялі ўдзел старшыня аблвыканкама Пётр Руднік, памочнік Прэзідэнта РБ — галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь Лаўранкоў і член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір Панцюхоў.

З іх удзелам было разгледжана 13 пытанняў. Галоўныя з іх датычыліся стварэння пастаянных камісій, абрання прэзідыума аблсавета і зацвярджэння плана работы аблсавета на сёлета. Як адзначыў старшыня абласнога Савета дэпутатаў Анатоль Ісачанка, асноўнымі кірункамі застаецца праца па ўдасканаленні турыстычнага патэнцыялу рэгіёна, будаўнічай галіны, рэалізацыі праграмы «Чыстая вада.»

Бурнае абмеркаванне выклікаў праект па апрабаванні механізму лячэння хворых на туберкулёз на амбулаторным этапе — з ім да народных абраннікаў звярнуўся начальнік упраўлення аховы здароўя аблвыканкама Уладзімір Шрубаў. Сэнс у тым, што, калі лячыць бальных, якія ўжо не ўяўляюць рэальную пагрозу для грамадства, у хатніх умовах, можна сэканоміць бюджэтныя сродкі. Меркаванні падзяліліся, але большасць прыйшла да высновы, што справа добрая і мае права на існаванне.

Падчас сесіі былі зацверджаны межы сельсаветаў Горацкага, Крычаўскага і Асіповіцкага раёнаў, якія змяніліся летась у сувязі з аптымізацыяй.

У рамках мерапрыемства адбылася цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў конкурсаў «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» і «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі». Кіраўнікі 30 прадпрыемстваў рэгіёна атрымалі дыпломы з рук старшыні Магілёўскага аблвыканкама Пятра Рудніка.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ДАПАМАГЧЫ, АЛЕ Ў МЕЖАХ ЗАКОНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

«У Мінскай вобласці шмат кар'-ераў аддадзена ў прыватныя рукі, — зрабіў выснову губернатар. — Усе яны будуць вернуты дзяржаве. Гэта стала прадметам спекуляцыі, выкарыстаннем агульнанароднай уласнасці ў асабістых мэтах асобнымі фірмамі. У выніку даражэюць будаўніцтва жылля, дарог».

Вымова за валакіту

Губернатар катэгарычны ў тым, каб хтосьці нажываўся на народнай уласнасці. А вось Марыі Кеўліч і шматдзетным сем'ям, што стаяць у чарзе на атрыманне льготнага крэдыту для будаўніцтва індывідуальнага жылля, ён пастараецца дапамагчы. Магчыма, у перспектыве атрымаецца павялічыць памер крэдытавання для гэтай катэгорыі грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Людміла Паўлюкоўская — настаўніца малодшых класаў — не можа засяліцца ў пабудаваную ў 2010 годзе кватэру, за якую даўно разлічылася. Забудоўшчык не аддае дакументы і ключы, патрабуючы даплаціць 37,5 млн рублёў. Разам з тым, жанчыне штомесяц налічваюць аплату за камунальныя паслугі, за якія яна спраўна плаціць. Чаму так атрымалася? Справа ў тым, што дом стаў даўгабудам. Ды толькі не вінаватыя ў гэтым жыльцы... Губернатар распарадзіўся выдаць заяўніцы ключы і праінфармаваць яго, чым закончыцца судовая справа.

Васіль Сіманаў з Дзяржынскага раёна не можа ўзаконіць зробленую ім перапланіроўку кватэры: не дазваляюць адпаведныя службы райвыканкама. Пры гэтым апорныя сцены не парушаны, змены ў кватэры нязначныя. Пазіцыя мясцовых улад абурыла губернатара. Сямён Шапіра аб'явіў вымову намесніку старшыні райвыканкама па будаўніцтве і жыллёва-камунальнай гаспадарцы.

Большасць праблем, з якімі людзі ідуць да губернатара, можна вырашыць на пасялковым, раённым ці гарадскім узроўні. Напрыклад, падчас кожнага прыёму ў рэгіёнах абавязкова прысутнічае тэма капітальнага рамонту жылых дамоў, дарог, газіфікацыі населеных пунктаў, водазабеспячэння. Неаднаразова губернатар падкрэсліваў, што мясцовыя ўлады павінны распрацаваць адпаведныя графікі першачарговага правядзення работ. Прычым надрукаваць іх у мясцовых сродках масавай інфармацыі. Нядрэнна было б у кожнай раённай газеце стварыць «гарачую» лінію, куды б маглі патэлефанаваць з набалелым. Акрамя таго, сёлета мясцовыя Саветы дэпутатаў папоўніліся новымі ініцыятыўнымі абраннікамі. Нямала тут і вопытных — тых, каму людзі аказалі давер у другі і нават трэці раз. І ім, і ўсім іншым трэба працаваць так, каб псіхалогія некаторых нашых суайчыннікаў — маўляў, прыедзе вялікі начальнік і расставіць акцэнты — змянілася на карысць мясцовых органаў улады.

«НА ПЕНСІІ НЕ ЗАСУМУЮ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Ёсць свая «кропка» ў яе і на Блакітнай крыніцы, куды едуць лячыцца з усіх краін СНД. У выхадныя тут заўсёды хапае народу. Юшка, піражкі і курыны шашлык, якія яна гатуе разам з дачкой, разыходзяцца без праблем. Быў выпадак, калі адзін шчодры пакупнік забраў оптам... усе 70 піражкоў — так яны яму спадабаліся. Нават чай, які завараецца ў старадаўнім самавары на вуглях, карыстаецца нязменным поспехам. У яго нават смак іншы.

Француз на жалезным ложку

Міхайлоў хаця і невялічкая вёска, але госці сюды прыязджаюць нават з-за мяжы. І ўсё дзякуючы няўрымслівай Людміле. Некалькі гадоў таму яна разам з дачкой занялася аграэкатурызмам. Хто толькі за гэты час на яе сядзібе ні гасцяваў! Шмат кліентаў пабывала па лініі мясцовага фонду развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра», які супрацоўнічае з «Сяльчанкай». Нават з Францыі.

— Мяне папярэдзілі, каб я французам не прапаноўвала металічныя ложкі: маўляў, гэта пяражытак савецкага мінулага, а яны — людзі далікатныя, адзін нават працуе ў парламенце, — усміхаецца Людміла. — Але гэты самы парламентарый, як убачыў той ложак, на іншыя і глядзець не захацеў. Прыйшлося ўступіць. А раніцай за сняданнем ён прызнаўся, што сам родам з Расіі і ўсё дзяцінства на такім ложку правёў. Казаў, сны такія цудоўныя бачыў, што не хацелася нават прачынацца.

Гэты ложак наогул асаблівы. Аднойчы на чарговым семінары па аграэкатурызме гаспадарам сядзіб прапанавалі прыдумаць свае «фішкі», каб зацікавіць гасцей. «А ў мяне ёсць чароўны ложак, — заявіла яна. — Хто тры дні на ім паспіць, у хуткім часе народзіць дзіця. Нават калі дагэтуль былі праблемы». Яе крэатыў ацанілі. Але хто ў гэтыя казкі сёння верыць? Магчыма, і казка, але госці нават у чаргу становяцца, каб трапіць на гэты ложак. «А вы не сумнявайцеся, — хітра ўсміхаецца яна. — Мая дачка на ім спала, цяпер чацвёра дзяцей выхоўвае. Ад старадаўніх рэчаў ідзе вельмі добрая энергетыка. Я спецыяльна іх захоўваю, каб у доме ўтульна было.

Аднойчы Людміле сказалі: «Ты жывеш так, быццам 200 гадоў сабе адмерала». Яна толькі паспачувала гэтаму чалавеку. Дзівак, ён не ведае, што сэнс жыцця менавіта ў тым, каб нешта рабіць не толькі для сябе, а і для іншых. «На пенсіі, — смяецца яна, — я дакладна не засумую».

Нэлі ЗІГУЛЯ.

МЯСЦОВЫ ЧАС

АДКУЛЬ У БЮДЖЭЦЕ ГРОШЫ? ЗАРАБІЛІ!

У Полацкім раёне сельсаветы ўсё больш зарабляюць самі. З некаторых крыніц аб'ём папаўнення бюджэту складае сотні мільёнаў рублёў штогод. Але і іншыя, невялікія, даходы — таксама прагрэс. З'яўляюцца і новыя падыходы да магчымасці «атрымліваць капейку».

Фота Анатоля КІПІЧУКА.

— Пакуль што ў цэлым Полацкі раён датуецца — прыкладна на 30%. Нагадаю, што раён і горад аб'ядналіся ў адну адміністрацыйную адзінку. А Полацк, у адрозненне ад Наваполацка, не настолькі развіты ў прамысловым пытанні горад. Таму знайсці любую магчымасць зарабляць больш — для нас вельмі важна. І радуе, што кіраўнікі сельсаветаў вучацца гэтаму, — расказвае **Іосіф ГРЫБОВІЧ, старшыня Полацкага раённага Савета дэпутатаў.**

Паводле яго слоў, асноўная крыніца папаўнення казны раёна — падаходны падатак. Яго доля ў бюджэце — 76%. Акрамя гэтага нямала грошай трапляе ў бюджэт ад падатку на нерухомасць: сёлета з гэтай крыніцы плануюць паступленне 1 мільярда рублёў (прыкладна на 7% больш, чым у мінулым годзе).

Полацкі раён вядомы тым, што ў тутэйшых лясах шмат грыбоў і ягад. На зборы з нарыхтоўшчыкаў дароў лесу ў год зарабляюць прыкладна 200 мільёнаў рублёў. Лідар у гэтым пытанні Маласітнянскі сельсавет. Тут маляўнічыя мясціны, побач — Расія. Дарэчы, усё больш расіян купляюць зямлю на аўкцыёнах пад будаўніцтва дач.

Цікава, што менавіта Полацкі раён — адзін з лідараў на Віцебшчыне па колькасці аграрных сядзіб і турыстаў, якія іх наведваюць. Сёння прымаюць гасцей больш як 20 сядзіб. І штогод колькасць адпачывальнікаў павялічваецца. Гасцінныя ўладальнікі невялікіх «вясковых курортаў» прапануюць турыстам захапляльныя пешыя, веласіпедныя і водныя падарожжы. У большасці сядзіб арганізуюць правядзенне нацыянальных беларускіх абрадаў: «Купалле», «Вадохрышча» і іншыя, а таксама самых розных культурна-забаўляльных мерапрыемстваў.

Брэндамі раёна сталі лазневы, малочны, грыбны, ягадны і іншыя фестывалі. У якасці экзотыкі — нават чэмпіянат па лоўлі ракаў. У гэтых фэстах, безумоўна, могуць узяць удзел і турысты.

Акрамя таго, гасцям падабаюцца стравы нацыянальнай кухні, садавіна і агародніна — з падворкаў вясковых сядзіб. Таму ўжо нямала і пастаянных кліентаў.

Прыезджых прыемна здзіўляе не толькі гасціннасць, але і тое, што ў сельскай мясцовасці ўсё добраўпарадкавана.

— Вельмі добра пастаўлена работа ў гэтым кірунку ў Фарынаўскім сельсавеце, які ўзначальвае Міхаіл Шульга. Раней ён кіраваў сельскагаспадарчай арганізацыяй. Наогул пра Фарынава можна расказаць асобна. Вельмі добраўпарадкаваны населены пункт, дзе шмат малых архітэктурных формаў, месцаў адпачынку. Менавіта Фарынаўскі заняў 1 месца ў раённым конкурсе па пытаннях навядзення парадку на зямлі, — працягвае кіраўнік прадстаўнічай улады раёна.

Даход ад рэкламы ў сельсаветах пакуль што невялікі — усяго толькі 0,3% ад агульнай сумы зароблены грошай.

— Але і на гэтым вучымся зарабляць. Хоць трохі, але ўжо сёе-тое ёсць, — дадае Іосіф Грыбовіч. — У апошні час актыўна карыстаемся тым, што кладзём грошы ў банк пад працэнты, прычым на гэтым зарабілі даволі значную суму. Зарабляем і на здачы ў арэнду зямельных участкаў. Штрафы — таксама крыніца паступленняў...

Як падкрэсліў старшыня райсавета, не было першапачатковай задачы зрабіць штрафы стабільнай крыніцай даходу. Проста працу гэту актывізавалі. Калі да парушальнікаў, як гаворыцца, не даходзіць, што нельга траву паліць на тэрыторыі падворка, што за несанкцыянаваныя звалкі і іншыя парушэнні трэба адказваць — дык чаму не караць рублём?

У штаце мясцовай арганізацыі ЖКГ ёсць спецыялісты, якія працуюць з насельніцтвам. (Спачатку прадпісанні выпісваюць, потым пратаколы афармляюць). І санстанцыя актыўна штрафуе жыхароў, каб парадак быў на зямлі. І эколагі сочаць, каб прыроду беражлі... А грошы з тых, хто «праштрафіўся», ідуць у мясцовы бюджэт.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Полацк — Віцебск

«ДЭПУТАТ ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Што тычыцца дэпутатаў сельскіх Саветаў, то летась на пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні мы выказалі сваё меркаванне, што дэпутат пярвічнага звяна павінен быць, бо ён бліжэй за ўсё да свайго выбаршчыка. На адлегласці ж складана ўбачыць патрэбы кожнага чалавека.

— Як вы думаеце, мясцовае самакіраванне ў Беларусі ўжо дасягнула піку свайго развіцця ці тут яшчэ ёсць да чаго імкнуцца? Чаму, на ваш погляд, у гісторыі суверэннай Беларусі пакуль не было ніводнага мясцовага рэферэндуму?

— Заўсёды ёсць да чаго імкнуцца. Пра тое, што мясцовае самакіраванне не стаіць на месцы, сведчаць у тым ліку і новаўвядзенні, пра якія я вам расказала. Калі казаць пра мясцовыя рэферэндумы, то Канстытуцыя прадастаўляе такую магчымасць. Але сёння мы не маем у ім вострай неабходнасці. Навошта праводзіць рэферэндум, калі ўсе праблемныя пытанні можна абмеркаваць на сходах грамадзян, на сходзе актыву Савета? Ды і дэпутаты пастаянна ў акругах бываюць, а калі нейкае пытанне ўзнікае, дапамагаюць яго вырашыць.

— Святлана Міхайлаўна, не так даўно вы вярнуліся са Страсбурга, дзе прымалі ўдзел у 26-й сесіі кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы. Які станоўчы вопыт, на ваш погляд, няблага было б пераняць нам ад краін ЕС для развіцця мясцовага самакіравання і чаму яны могуць павучыцца ў нас?

— Мы, як члены Савета па ўзаемадзеянні, з 2009 года маем статус назіральнікаў і рэгулярна ўдзельнічаем у сесіях Кангрэса Савета Еўропы. Асабіста я, калі еду за мяжу, выкарыстоўваю любую магчымасць пакантактаваць з кожнай дэлегацыяй, паслухаць іх і расказаць, чым жывём мы, што сабой уяўляе Беларусь. Міжнародныя адносіны — адзін з важных кірункаў дзейнасці камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. Мы абменьваемся вопытам па законапраектнай дзейнасці з Расіяй, Латвіяй, Турцыяй, наладжваем дзелавыя стасункі з Германіяй. У верасні ў нас былі два старшыні палат мясцовых і рэгіянальных улад Кангрэса Савета Еўропы. Яны былі ў захапленні ад таго, што ўбачылі: ад нашых будынкаў Саветаў, амбулаторый, бальніц, дарог і, вядома, ад нашых дэпутатаў і старастаў вёсак. Увогуле ад нашых людзей. Мы і далей на прынцыпах раўнапраўя і павагі будзем супрацоўнічаць з Кангрэсам Савета Еўропы. А 5-6 чэрвеня ў Мінску адбудзецца першы форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, на якім абмяркуем перспектывы развіцця агрэпрамысловых комплексаў Саюзнай дзяржавы. Плануем пашырыць кантакты паміж рэгіёнамі, выпрацаваць рэкамендацыі па ўдасканаленні нарматыўна-прававой базы для развіцця эканомік краін ва ўмовах стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза.

Надзея ДРЫЛА.

СТЫХІЯ

ПАЦЯРПЕЛІ АД НАВАЛЬНІЦЫ

У панядзелак ад праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру да 20 метраў за секунду пацярпелі 42 населеныя пункты ў Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях.

Паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, у выніку былі пашкоджаны дахі 319 жылых дамоў, 7 аб'ектаў сацкультбыту, 103 сельскагаспадарчыя будынкі. У Ельску з-за дажджу ў перыяд з вечара 18 мая па раніцу 19-га (выпала 30 міліметраў ападкаў пры сярэднямесячнай норме 55 міліметраў) былі падтоплены чатыры жылыя і адзін нежылы дамы, сем сельскагаспадарчых пабудоў. Раніцай падчас руху аварыйнай брыгады раённых электрасетак у вёску Бабруйкі службовы аўтамабіль праваліўся ў меліярацыйны канал: на аўтадарозе над шлюзам з-за падмыву дарожнага палатна ўтварыўся правал дарогі памерам 10х12 метраў. На шчасце, ніхто не пацярпеў. Участак дарогі аднавілі ў той жа дзень.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НАВІНЫ З РЭГІЁНА

Скідзель стаў спадарожнікам

Згодна з указам кіраўніка дзяржавы, Скідзелю нададзены статус горада-спадарожніка Гродна

Да сакавіка наступнага года будзе распрацаваны новы генеральны план яго развіцця з улікам пытанняў, што тычацца дзейнасці мясцовых арганізацый эканамічнай і сацыяльна-культурнай сфер, транспарту, інжынерных камунікацый і іншых аб'ектаў інфраструктуры. Мяркуецца, што ў Скідзелі павінны значна павялічыцца аб'ёмы будаўніцтва жылля (зямельных участкаў хапае), што таксама дапаможа вырашыць кадравыя праблемы тутэйшых прадпрыемстваў: бройлернай фабрыкі, куды цяпер возяць рабочых з чатырох бліжніх раёнаў і абласнога цэнтра, цукровага камбіната, агракамбіната «Скідзельскі» і іншых. Не выключана, што па жаданні часткі чаргавікоў на жыллё ў Гродне яны будуць пераарыентаваны на горад-спадарожнік, што дазволіць ім хутчэй атрымаць кватэры.

Навошта куплялі прэс?

Гэтым пытаннем задаліся спецыялісты Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці падчас праверкі Зэльвенскага раённага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Летась у кастрычніку камунальнікі набылі прэс пакеціровачны гідраўлічны. Затрачана 39 млн рублёў бюджэтных сродкаў і 3 млн рублёў — уласных. Нядаўна новае абсталяванне ўведзена ў эксплуатацыю. Але навошта, з якой аддачай ад затрачаных грошай? З 2011 года прадпрыемства выкарыстоўвае прэс для адходаў паперы, картону і ПЭТ-бутэлек, загрузка якога далёкая ад аптымальнай. За 2012 год — 20 рабочых дзён (каля 16 тон), летась — 36 дзён (29 тон). Такім чынам, бюджэтныя сродкі на набыццё новага прэса выдзелены неабгрунтавана, бо абсталяванне фактычна прастойвае, лічыць Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці.

За здаровую нацыю

На чарговай, трэцяй сесіі маладзёжнага парламента, які дзейнічае пры Ваўкавыскім раённым Савеце дэпутатаў, прынята рашэнне аб правядзенні сёлета акцый «Чысты горад», «Мы — за здаровую нацыю», а таксама злёту валанцёрскіх атрадаў.

У «скарбонцы» дэпутатаў, якія прадстаўляюць у маладзёжным парламенце навучальныя ўстановы раёна, ужо нямала добрых спраў. Па іх ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле пасаджаны дрэвы на алеях Маці і Памяці, праведзены раённыя конкурсы «Ану, дзяўчаты!» і «Лідар года». На сайце аддзела адукацыі райвыканкама створана электронная маладзёжная прыёмная, дзе можна выказацца па пытаннях арганізацыі адпачынку, працоўнай занятасці, сацыяльна значных праблемах.

Дарэчы, ініцыяваная маладзёжным парламентам працоўная акцыя «Чысты горад» адразу ж увасобілася ў канкрэтныя справы: прыбіранне і азеляненне тэрыторый, упрыгажэнне іх новымі дрэвамі.

З павагай да спадчыны

Цэнтр «Спадчына» будзе створаны ў горадзе над Нёманам у рамках міжнароднага праекта «Адраджэнне і захаванне культурнай і гістарычнай спадчыны ў г. Даўгаўпілсе і г. Гродна».

Ужо распрацаваны праект гэтага цэнтра і распачаліся будаўнічыя работы. Ідэя ў тым, каб разам з музейнымі экспазіцыямі па гісторыі традыцыйных для Гродзеншчыны народных рамёстваў знаходзіліся і майстэрні цяперашніх рамеснікаў, якія прапануюць наведвальнікам свае вырабы ў самых розных жанрах — вышыўка, саломапляценне, разьба па дрэве, кераміка.

Будзе абсталяваны і невялікі амфітэатр са сцэнай для выступленняў фальклорных гуртоў.

Партнёры па сумесным праекце з Даўгаўпілса, са свайго боку, праводзяць рэстаўрацыю Дынабургскай крэпасці. Акрамя таго, будуць выдадзены кніга па рамёствах Гродзеншчыны і Латгаліі (на трох мовах) і турыстычны каталог рамесных майстэрань Гродна (на сямі мовах).

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ТЭНДЭНЦЫЯ

КАРОВА НА ПАДВОРКУ: ці лёгка яе трымаць сучаснаму вяскоўцу?

Ніна Лукінічна Панасюк да мінулага года трымала ў сваёй гаспадарцы чатыры каровы. Цяпер іх засталося дзве. Жанчыне ўжо за семдзесят, але расставацца са сваімі любімцамі яна пакуль не збіраецца.

Ніна Лукінічна 42 гады адпрацавала даяркай у калгасе. «Столькі, відаць, не вытрымала б на такой нялёгкай рабоце, каб не любіла жывёлу, — разважае пра тыя гады пенсіянерка. — А так прывыкла». І ўжо не ўяўляе сабе, як можна жыць у вёсцы, каб хлеў быў пусты. Яшчэ былы прафесійны жывёлавод лічыць, што для каровы найлепшыя ўмовы менавіта ў хляве на саломцы. «Тую карову, што прадала, я 19 гадоў трымала, — расказвае жанчына. — А ў гаспадарках цяпер на сучасных комплексах, дзе нібыта захоўваюць новыя тэхналогіі, нярэдка праз пяць гадоў увесь статак мяняюць. Бо ў кароў баляць ногі. Значыць, нешта не так робіцца на новых фермах, няправільна».

Каб кароўка здаровая была, добра малако давала, яе трэба любіць, — лічыць Ніна Лукінічна. Жывёла адчувае адносіны свайго гаспадара. Пенсіянерка і любіць сваіх рагуль, бывае, паразмаўляе з імі, кожную пагладзіць, час ад часу нечым смачненькім пачастуе. Яны наогул ручныя, а за гаспадыняй ідуць, як тыя сабачкі.

Але ў вёсцы Пяскі Камянецкага раёна каровы засталіся толькі на яе, Лукінічны, падворку. Тэндэнцыя. З кожным годам усё менш буйной рагатай жывёлы становіцца ў асабістых гаспадарках вяскоўцаў. Бо жывёла патрабуе штодзённага догляду. Карова ў гаспадарцы — праца без водпускаў і выхадных. А яшчэ — нялёгкі клопат пра нарыхтоўку кармоў, пра летнюю пашу. Гэтыя задачы для цяперашніх маладых гаспадароў нярэдка здаюцца невырашальнымі. Таму і радзее ўласны статак.

Паколькі Ніна Лукінічна чалавек даволі пажылы і адной ёй было б справіцца цяжка, даглядаць кароў дапамагае дачка Зінаіда. Зінаіда Міхайлаўна Сакалюк жыве ў горадзе Высокае, за некалькі кіламетраў ад роднай вёскі. Але штодня а палове шостай ужо выводзіць каровак на ранішнюю пашу. Нічога, што ўставаць даводзіцца амаль у чатыры раніцы. Яна таксама любіць жыўнасць. Гэтую любоў да дамашняй жывёлы ёй перадала маці. Таму Зінаіда Міхайлаўна пакуль ва ўсім падтрымлівае маці і не збіраецца зводзіць гаспадарку. Хоць і сваіх клопатаў хапае: яна зарэгістравана як індывідуальны прадпрымальнік. Каб мець нейкі даход са сваёй справы, «круціцца» даводзіцца цэлымі днямі. А вось раніцы і вечары жанчына прысвячае ўласнай гаспадарцы.

— Вядома, буйную рагатую жывёлу нялёгка трымаць, — разважае Зінаіда Міхайлаўна. — Здаецца, цяпер пашы хапае. Але гэта толькі на першы погляд. Раней каля рэчкі спрадвеку кароў пасвілі. Цяпер там статак не ходзіць, траву ніхто не скошвае. Яна здзічэла, збуяла, стала непрыдатнай для выпасу кароў. Таму нам адвялі невялікі ўчастак на полі мясцовага сельгаспрадпрыемства.

І самы вялікі клопат — кармы. Гаспадарка выдзяляе малаказдатчыку паўтары тоны сена на сезон. Заплаціш грошы, табе прывязуць тры рулонныя цюкі адразу на падворак. Але гэтага мала нават на адну карову. Выпісаць у калгасе дадаткова сена для каровы не заўсёды атрымліваецца, бо для калектыўнага статка нарыхтоўваюць у асноўным сіласы, сенажы, а вось сена сушаць зусім не шмат. Вясковыя ж каровы ўсю зіму жывуць на сене, бо іншыя кармы ў хатніх умовах не захаваеш.

— Таму даводзіцца літаральна выкручвацца. Брат выпісвае кармы ў сваёй гаспадарцы, недзе яшчэ купляем, — расказвае Зінаіда Сакалюк.

Раней у вёсках усе кармы на карову нарыхтоўвалі з дапамогай касы. Цяпер косы выходзяць з ужытку. Нават падворкі вяскоўцы выкошваюць электрычнымі і бензінавымі касілкамі. Касіць у састарэлых вяскоўцаў сіл не хапае, маладыя не маюць часу, бо ўсе працуюць, ды і прывычкі такой няма. Вось і паўстае адно з галоўных пытанняў: дзе ўзяць кармы? У большасці адказ на яго знаходзіцца проста: кароўку адводзяць... на прыёмны пункт...

Таму пакідаюць ва ўласнай гаспадарцы рагулю толькі тыя гаспадары, якія не баяцца працы, прывыклі рана ўставаць і працаваць дапазна. Амаль усе з іх, хто мае карову, здаюць малако дзяржаве.

Агародніцкі сельскі Савет, дзе жыве Ніна Панасюк, ужо некалькі гадоў не займаецца зборам малака. Як расказаў старшыня Савета Барыс Данілюк, апошнія гады малако ў людзей збірае прыватнае гандлёвае прадпрыемства «БУШсэрвіс». Яго кіраўнік Анатоль Швейкус набыў легкавыя аўтамабілі, якія аснасцілі неабходным абсталяваннем для збору і перавозкі. Спачатку збіралі лішкі малака з пятнаццаці падворкаў, цяпер зона іх абслугоўвання — тэрыторыя чатырох сельсаветаў. І гэта сябе апраўдвае. У адрозненне ад малакавозаў, легкавыя спецыялізаваныя аўтамабілі эканамічныя і адрозніваюцца манеўровасцю. Ездзіць ім даводзіцца шмат. Напрыклад, самы аддалены ад Высокага населены пункт знаходзіцца за 90 кіламетраў. Але і туды малаказборшчыкі заўсёды прыбываюць па графіку.

— Здаём малако, — расказвае Зінаіда Сакалюк, — хоць закупачная цана ў суме 3200 рублёў за літр, згадзіцеся, цяпер выглядае вельмі сціплай. Але ж для сябе сапраўды малака ў сезон бывае многа, а гэта — жывыя грошы, падмога для сям'і пенсіянераў ды іх дзяцей. Так што карова заўсёды сябе акупляе.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Ніна Лукінічна Панасюк.

Як расказала карэспандэнту «МС» старшыня Камянецкага раённага Савета дэпутатаў Ірына НІГЕРЫШ, на пачатку гэтага года ў асабістых гаспадарках вяскоўцаў раёна ўтрымліваецца 740 кароў. Гэта, дарэчы, на 195 галоў менш, чым летась.

— Памяншэнне асабістага статка — аб'ектыўная рэальнасць, абумоўленая ростам жыццёвага ўзроўню вяскоўцаў, — сказала Ірына Іванаўна. — Маладое пакаленне працаўнікоў вёскі арыентуецца на тое, каб мець гарантаваны выхадны дзень, які дазволіў бы з'ездзіць з сям'ёй у горад, здзейсніць нейкія іншыя планы па адпачынку. Тым больш што малако і малочныя прадукты можна купіць у любой вясковай краме.

Сельгаспрадпрыемствы раёна ўсё ж дапамагаюць людзям трымаць на сваім падворку карову. Сёлета падкошана і падкормлена 95 гектараў пашы для асабістага статка вяскоўцаў. Большасць гаспадарак, такія, як вышэйзгаданае «Александрыя-Агра» ў Агародніках, «Відамлянскае», прадаюць гатовае сена, якое ў цюках прывозяць непасрэдна на падворак гаспадару. Прадаюць кармы не толькі пад восень, але і на працягу года. Сёлета толькі за першы квартал было рэалізавана насельніцтву 5 тон сена і 8 тон саломы.

— А здаваць малака нашы вяскоўцы сталі больш. З пачатку года ад прыватнай каровы ў сярэднім закуплена 635 кілаграмаў малака. Гэта на 20 кілаграмаў больш, чым летась, — сказала Ірына Нігерыш.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Камянецкі раён.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет:

ГЕРАСІМОВІЧ С.М., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні;

АЦЯСАЎ А.Я., старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў;

НАВУМЕНКА А.В., старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў;

СУШЧАНКА М.Л., старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.836. Нумар падпісаны ў 19.30 20 мая 2014 года.

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННЫХ ПОМЕЩЕНИЙ, находящихся в собственности ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка» 23 июня 2014 года

№ лота	Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь)	Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб. (с учетом НДС)	Размер задатка, бел. руб.	Характеристика объекта	Условия аукциона
1	Изолированное помещение с инвентарным номером 700/Д-99090 площадью 364,5 кв.м (1 этаж) в г. Могилеве, ул. Ленинская, 91, пом. 2; изолированное помещение с инвентарным номером 700/Д-99091 площадью 977,8 кв.м (1 этаж) в г. Могилеве, ул. Ленинская, 91, пом. 3; изолированное помещение с инвентарным номером 700/Д-99093 площадью 1 567,1 кв.м (2 этаж) в г. Могилеве, ул. Ленинская, 91, пом. 5; изолированное помещение с инвентарным номером 700/Д-99094 площадью 1 884,9 кв.м (3, техэтаж) в г. Могилеве, ул. Ленинская, 91, пом. 6. Общая площадь помещений – 4 794,3 кв.м.	16 139 520 000	806 976 000	Изолированные помещения расположены на 1, 2, 3 и техэтаже 3-этажного крупнопанельного здания 1986 г. постройки. Стены – крупнопанельные; перегородки – гипсобетонные; перекрытия – железобетонное; проемы оконные-двойные окрашены, проемы дверные – простые; крыша – рулонная совмещенная; полы – бетонные. Имеется центральное отопление, электроснабжение, водопровод, канализация, телефон, лифт.	Без условий, за исключением того, что покупатель не использует в процессе предпринимательской деятельности данные площади для швейного производства

Начальная цена продажи снижена на 20 процентов.
Аукцион состоится 23 июня 2014 года в 16.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.
Заявки принимаются ежедневно с 22 мая 2014 г. в рабочие дни с 8 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
Последний день приема заявлений и внесения задатка – «19» июня 2014 года до 17.00 часов. Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.
Заключительная регистрация участников аукциона 23 мая 2014 года с 15.30 до 16.00.
Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 12.07.2013 г. № 609 (зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов Республики Беларусь 26 июля 2013 г. № 5/37597)

Продавец предмета аукциона – ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка», г. Могилев, ул. Ленинская, 91, контактные телефоны – 25-73-42, 25-12-07, 22-92-54, 22-15-57.

Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны – 22-21-78, 22-00-89.

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, подают заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются:

- **документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации» 3012430089016 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, МФО 153001739, УНН 700008710 с отметкой банка;

- **юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- **иностранным юридическим лицом** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- **иностранным индивидуальным предпринимателем** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- **представителем юридического лица Республики Беларусь –** доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

- **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь –** нотариально удостоверенная доверенность:

- **представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя –** доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе с приложением всех необходимых документов, внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, заключившие с организатором аукциона соглашение, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе и получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона. Объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в том же печатном издании, в котором публиковалось извещение. Кроме того, организатор аукциона должен проинформировать участников, подавших заявление на участие в аукционе, об отказе от проведения аукциона.

Перед началом аукциона их участники обязаны зарегистрироваться у организатора аукциона и обменять билеты участников на аукционные номера, которые возвращаются организатору аукциона после их окончания.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наивысшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов (далее – единственный участник аукциона).

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона, обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение аукциона, в установленном порядке, в соответствии с подписанным в день проведения аукциона соответствующим протоколом, между продавцом предмета аукциона и победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается договор купли-продажи предмета аукциона.

Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником аукциона) в белорусских рублях в установленном порядке.

Условия оплаты – оплата производится в течение 2 месяцев с момента заключения договора купли-продажи, но не позднее 29.08.2014 г.

С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов, предварительно согласовав время с продавцом.

В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 100 000 000 (Сто миллионов) белорусских рублей: победителем аукциона в случаях не подписания протокола о результатах аукциона, не возмещения организатору аукциона суммы затрат на организацию и проведение аукциона, не заключения договора купли-продажи предмета аукциона; единственным участником аукциона – в случае отказа или уклонения от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, заключения договора купли-продажи предмета аукциона; участниками аукциона, отказавшимися предложить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.

Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: г. Могилев (0222) 22-21-78, 22-00-89.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в населенных пунктах д. Сосновая, д. Батуринка, д. Багута, д. Скураты Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

1.	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2.	**Дата, время и место проведения аукциона**	26 июня 2014 года, в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний
3.	**Продавец и его адрес**	Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27
